ВЕРАСЕНЬ 7
СУБОТА
№ 27 (483)
1940 год
ЦАНА 20 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І УПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

НА ВЯЛІКІМ ПАД'ЁМЕ

Вызваленыя Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыяй народы былой царскай Расіі зажылі поўнакроўным духоўным жыццём. Дзякуючы мудраму правядзенню ленінска - сталінскай нацыянальнай палітыкі і братняй дапамозе магутнага рускага народа падцягнута культура ўсіх народаў СССР да ўзроўню вялікай рускай культуры.

І цяпер, у разгар другой імперыялістычнай вайны, калі мастацтва ў капіталістычных краінах канчаткова гіне, совецкае мастацтва дзякуючы клопатам і ўвазе партыі і ўрада, вялікага Сталіна няўхільна развіваецца, заваёўвае ўсё новыя і новыя вышыні. Ствараецца новая, соцыялістычная культура. Совецкі народ бязмежна ўдзячан партыі і ўраду, мудраму Сталіну, што наша краіна выведзена з вайны, што народы СССР спакойна працуюць, будуюць новае, нябачанае ў свеце комуністычнае грамадства. Але калі хто асмеліцца парушыць наш спакой, нашу мірную працу, совецкія людзі ўсе, як адзін, устануць на абарону сваёй любімай соцыялістычнай радзімы. І той, хто, страціўшы розум, падыме на яе руку, той страціць і сваю неразумную галаву.

Совецкі Саюз не толькі па сваёй палітычнай структуры, але і па культуры з'яўляецца перадавой краінай у свеце. Мы ствараем новую, перадавую соцыялістычную культуру, якая дапаможа працоўным свету пазбавіцца ад эксплаатацыі чалавека чалавекам. Цяпер мы вырашаем вялікай гістарычнай важнасці задачу перагнаць у эканамічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны. На вырашэнне гэтай задачы павінны быць кінуты ўсе сілы і сродкі. Пад кіраўніцтвам Комуністычнай партыі, вялікага Сталіна гераічны совецкі народ і гэту задачу з поспехам выпаўніць.

У сучаснай міжнароднай абстаноўцы, калі мажлівы ўсялякія нечаканасці, совецкія людзі павінны быць асабліва падцягнутымі, заўсёды быць напагатове, гатовымі ў любую хвіліну адказаць двайным ударам на ўдар. Нам неабходна ўсямерна ўзмацняць абараназдольнасць нашай краіны. Нашы фабрыкі і заводы павінны даць большую колькасць і лепшай якасці прадукцыі. Нашы калгасы павінны даць больш прадуктаў. Наш дзяржаўны апарат павінен лепш працаваць. Гэтаму садзейнічае Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня аб умацаванні працоўнай дысцыпліны. Кожны совецкі грамадзянін, якому дарагі заваёвы Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, павінен змагацца за няўхільнае выкананне гэтага указа, што дапаможа ўзняць магутнасць нашай краіны на недасягаемую вышыню.

Совецкае мастацтва за два дзесяцігоддзі дасягнула выключных поспехаў. Калі ўзяць тэатр, дык мы ўжо маем некалькі п'ес, якія не сыходзяць са сцэны тэатраў СССР, як «Любоў Яравая», «Разлом», «Бронецягнік», «Пагібель эскадры», «Прафесар Палежаеў», «Аптымістычная трагедыя», «Шторм», п'есы Горкага; яны, відаць, надоўга застануцца ў рэпертуары нашых тэатраў і многія з іх смела можна аднесці да совецкай класікі. Што характэрна для ўсіх гэтых п'ес? У іх паказан гераізм нашага часу, яркія характары совецкіх людзей, адчуваецца магутнае дыханне нашай эпохі, паказан пафас нашых людзей, новы чалавек, які вядзе непрымірымую барацьбу са старым, аджыўшым светам, змагаецца за пабудову новага свету, за соцыялізм. Вялікі пачатак стварэння совецкай класічнай драматургіі зроблен.

Прайшоўшыя дэкады мастацтваў народаў СССР, у тым ліку і дэкада мастацтваў Беларускай ССР, паказалі, што мы ўжо можам прад'явіць мастацтву раней прыгнечаных народаў больш высокія патрабаванні, патрабаванні стварэння класічнага совецкага мастацтва. Для гэтага ў нас ёсць усе мажлівасці. Комуністычная партыя выхавала цэлую плеяду маладых таленавітых кадраў (актораў, мастакоў, драматургаў, кампазітараў, спевакоў) з народа, якія ўсілах вырашыць пастаўленую задачу. Совецкі чалавек аддае ўсяго сябе, усе свае сілы і розум на будаўніцтва новага, комуністычнага грамадства і ён хоча сябе бачыць паказаным у мастацтве. Совецкі чалавек цалкам аддан вялікім ідэям партыі Леніна — Сталіна, ён хоча сябе бачыць такім у мастацтве. Новы чалавек, герой нашага часу, будаўнік комунізма настойліва патрабуе паказу яго ў мастацтве ва ўсёй яго велічы. Пачэсная задача мастакоў паказаць гэтых людзей у творах, гэта значыць — паказаць нашу эпоху, стварыць совецкую класіку.

Дзяржаўны ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга Беларускі драматычны тэатр у гэтым сезоне ставіць п'есу Шэкспіра «Ромэо і Джульета». Гэта гаворыць аб спеласці беларускага тэатральнага мастацтва. Па-совецкаму паставіць лепшыя ўзоры сусветнай класікі, гэта значыць — узбагаціць беларускую соцыялістычную культуру. Мы ўпэўнены, што тэатр з чэсцю выканае пастаўленую перад сабой задачу.

Віцебскі Дзяржаўны беларускі драматычны тэатр, які працаваў ужо над паказам вобразаў геніяльных правадыроў рэволюцыі Леніна і Сталіна, зноў вяртаецца да гэтай пачэснай працы. Тэатр ставіць п'есу «Крэмлёўскія куранты» Пагодзіна. Совецкая грамадскасць чакае ад тэатра новых творчых перамог. Тое, што тэатр узяўся і прадаўжае працу над стварэннем у мастацтве вобразаў правадыроў народаў СССР і працоўных усяго свету, гаворыць аб тым, што ў калектыве ёсць зусім спелыя мастакі, якія ўсілах стварыць совецкую класіку.

Нас радуюць творчыя перамогі калектыва Дзяржаўнага Яўрэйскага тэатра БССР. Тэатр за апошні час паказаў гледачу цікавы спектакль «Цвэй кунелемлех». Цяпер для Яўрэйскага тэатра БССР Фіненберг і Ойслендэр пішуць п'есу «Уладзімір Ульянаў». Неабходна акружыць тэатр клопатамі і ўвагай з тым, каб дапамагчы калектыву стварыць па сваіх ідэйна-мастацкіх вартасцях значымы спектакль, які-б узбагаціў не толькі яўрэйскую, але і ўсю нашу культуру.

Вялікіх поспехаў дасягнуў Дзяржаўны ордэна Леніна тэатр оперы і балета БССР. Аднак для таго, каб стаць перадавым совецкім оперным тэатрам, каб стварыць совецкую беларускую музычную класіку, патрэбна яшчэ больш напружаная праца ўсяго калектыва, чым перад дэкадай. Але гэтага мы не адчуваем, наадварот, наглядаецца некаторае паслабленне. Асабліва дрэнна абстаіць справа з пастаноўкай новых опер. Адзіная арыгінальная опера «Кацярына» Шчэглова будзе пастаўлена тэатрам толькі ў канцы сезона.

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі выхавала таленавітыя кадры кампазітараў. Шмат зроблена за апошнія годы на музычным фронце. Але гэтага далёка недастаткова. Наш народ патрабуе большага, а іменна: музыкальнай совецкай класікі. Неабходна развіццё жанраў, напісанне сімфанічнай музыкі, стварэнне новых опер.

Совецкая грамадскасць з нецярпеннем чакае адкрыцця мастацкай выстаўкі «Ленін і Сталін—арганізатары беларускай дзяржаўнасці». Папярэдняе азнаямленне з працамі паасобных мастакоў гаворыць, што мастакі аднесліся да гэтай выстаўкі з усёй адказнасцю і многія з іх, працуючы над стварэннем у выяўленчым мастацтве вобразаў Леніна, Сталіна і іх бліжэйшых саратнікаў, дасягнулі вялікіх творчых поспехаў. Цяпер скульптары БССР працуюць над праектам помніка «Вызваленне Заходняй Беларусі ад белапольскіх паноў». Характэрным для мастакоў БССР з'яўляецца, што яны бяруцца за манументальную скульптуру, за шырокія палотны, у якіх імкнуцца паказаць веліч нашай гераічнай эпохі. Перад мастакамі БССР, як і перад акторамі, кампазітарамі, драматургамі, устала задача стварэння совецкай класікі.

Стварыць совецкае класічнае мастацтва, гэта значыць—авалодаць вышынямі мастацтва, асмысліць барацьбу, якая ідзе паміж старым і новым. Паядынак паміж старым і новым адбываецца на нашых вачах. І не гледзячы на велізарнейшыя цяжкасці, на перажыткі старога ў свядомасці людзей, што цягне назад, новае перамагае.

У жорсткай барацьбе са старым, аджыўшым, пазбаўляючыся ад старых звычак, нараджаюцца новыя людзі, ствараюцца новыя, соцыялістычныя грамадскія адносіны, змяняецца псіхічны склад людзей, іх інтэлект. Усё гэта патрабуе паказу ў мастацтве.

Пры праглядзе рэпертуару тэатраў БССР на новы тэатральны сезон кідаецца ў вочы невялікая колькасць арыгінальных п'ес у рэпертуарных планах тэатраў. Гэта можа пашкодзіць далейшаму развіццю беларускага тэатральнага совецкага мастацтва, паскарэнню стварэння совецкай класікі. Упраўленню па справах мастацтваў пры СНК БССР неабходна на гэта звярнуць увагу.

Новыя ўмовы патрабуюць новых метадаў кіраўніцтва работай мастацкіх устаноў. Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР павінна ўзначаліць барацьбу работнікаў мастацтваў Беларускай ССР за стварэнне совецкай класікі, за паказ у мастацтве новага чалавека, за паказ героікі барацьбы нашага народа за пабудову комунізма.

Совецкае мастацтва знаходзіцца на вялікім пад'ёме.

Максім ТАНК

ТАВАРЫШАМ ЛІТОЎЦАМ

Гэта песня прайшла праз гады і муры,
Павуціне парваўшы калючых дратоў.
Гэта песня гарэла ўначы і гарыць —
І таму на цымбалы кладу яе зноў.

Сёння пеніцца-бродзіць рабінавы хмель
У грудзях і у жылах мазолістых рук.
Толькі ўскінеш чупрыну—вішнёвая бель
Ападае
на звонкае
полымя струн.

Засцілайце сталы — нашы півы зарой.
Развівайце, вятры, туман ў полі сівы.
Мы за край, апаясаны Нёмнам-ракой,
За вясну,
што на крыллях
нясуць журавы,
І за моладасць даўніх баянаў-пяўцоў,
І за моладасць нашу,
за дружбу і шыр
Небасхілу, за даль неапетых шляхоў —
Падымаем з гарачаю брагай каўшы...

І за тых, каго песня збудзіць не магла
З-пад заломаных сумам
дарожных бяроз,
Без пары чыя моладасць перацвіла,
Чые вецер, галосячы, думы разнёс, —
Рана пойдзем парогі стальныя вайстрыць
І па хвалях раллі сеяць зоры зярнят,
Каб напоўніць каўшы пенай жытняй зары
І над новым жыццём, і над сонцам
падняць.

Толькі ў гэткія дні трэба ў струнаў лады,
Перастроіўшы, ўліць волі, сталь, тонаў
медзь, —
Каб ад цвету вачэй
і ад шчасця яны
Не рвучыся маглі зіхацець і грымець.
Бо ўжо з нашых апошніх жыцця рубяжоў
Не ўбачыць меж сокал, гусляр і ратай,
Толькі стэп на усходзе ў агні каласоў,
І на захадзе —
мора сінеючы край.

1939 г.

Напярэдадні гадавіны вызвалення Заходняй Беларусі



Метравая мадэль фігуры помніка Герою Совецкага Саюза С. І. Грыцаўцу, які будзе ўстаноўлен у Баранавічах. Работа засл. дзеяча мастацтваў БССР ордэнаносца З. І. Азгура. Фото І. Каплінскага.

ПЕРШАЯ ГАДАВІНА СВАБОДНАГА ЖЫЦЦЯ

З вялікай радасцю рыхтуюцца працоўныя БССР да знамянальнай гадавіны вызвалення Заходняй Беларусі ад белапанскага прыгнёту, гадавіны з'еднання беларускага народа.

Творчая работа кіпіць на ўсіх участках народнай гаспадаркі і культуры. З незвычайным уздымам будуюць працоўныя заходніх абласцей БССР сваё радаснае, шчаслівае, свабоднае жыццё. З кожным днём расце дабрабыт шырокіх працоўных мас, усё радасней гучаць песні вызваленага народа.

Гістарычную гадавіну вызвалення Заходняй Беларусі работнікі мастацтваў, калектывы мастацкай самадзейнасці адзначаюць шматлікімі святочнымі падарункамі. Асабліва многа падарункаў рыхтуюць работнікі мастацтваў і калектывы самадзейнасці заходніх абласцей БССР.

У **Баранавічах** 17 верасня адкрываецца музей выяўленчых мастацтваў, дзе сабраны значныя мастацкія каштоўнасці: фарфар, мэбля, экспанаты народнай творчасці, работы выдатных рускіх і еўрапейскіх мастакоў. Многія экспанаты адносяцца да XV, XVI і пазнейшых вякоў. Пры музеі ствараецца таксама бібліятэка рэдкіх кніг, з якіх многія з'яўляюцца унікальнымі.

Адначасова ў Баранавічах адкрыецца выстаўка самадзейнага выяўленчага мастацтва, на якой будуць прадстаўлены жывапіс, графіка, тканіна, вышыўка, разьба па дрэву, скульптура і т. д. У выстаўцы прымуць удзел мастакі-самавучкі ўсіх раёнаў вобласці, у тым ліку выхаванцы двух самадзейных студый, створаных у Баранавічах і ў Слоніме.

У дні гадавіны ў Баранавічах выйдзе з друку зборнік новых народных песень, сабраных па вобласці за апошні час і прысвечаных, галоўным чынам, прыходу Чырвонай Арміі і вызваленню працоўных Заходняй Беларусі ад белапольскіх акупантаў.

Работнікі мастацтваў вобласці пачалі соцыялістычнае спаборніцтва на лепшую сустрэчу гістарычнай гадавіны. У баранавіцкім гарадскім парку ў дні гадавіны адбудзецца вялікае гулянне і карнавал. У канцэрце, які арганізуецца ў парку, прымуць удзел лепшыя мастацкія сілы горада.

Баранавіцкі абласны тэатр адкрывае 17 верасня свой асенне-зімовы сезон. Тэатр пакажа гледачу п'есу народнага паэта БССР Якуба Коласа «У пушчах Палесся».

Польскі лялькавы тэатр у Стаўбцах арганізуе дзіцячае гулянне, прысвечанае гістарычнай гадавіне, і пакажа юнаму гледачу свае лепшыя спектаклі.

У **Беластоку** рыхтуецца вялікі канцэрт з удзелам лепшых артыстычных сіл горада. У канцэрце прыме таксама ўдзел самадзейны хор у складзе 80 чалавек, арганізаваны абласным Домам народнай творчасці. Для абслугоўвання прадпрыемстваў створана пяць канцэртных брыгад.

У **Вілейцы** арганізуецца паказ мастацкай самадзейнасці. Апрача мясцовых калектываў, у паказе ўдзельнічаюць слухачы курсаў падрыхтоўкі кіраўнікоў танцавальных гурткоў. Курсанты спецыяльна падрыхтавалі да свята рад беларускіх народных танцаў.

У **Пінску** 17 верасня адбудзецца вялікі канцэрт мастацкай самадзейнасці. У канцэрце прымуць удзел лепшыя калектывы вобласці, у тым ліку танцавальная група (у колькасці 14 пар) мястэчка Мікашэвічы, удзельнік дэкады беларускага мастацтва ў Маскве — хор лунінецкага Дома соцыялістычнай культуры, хор прамкааперацыі ў колькасці 50 чалавек, танцавальная група прамкааперацыі ў складзе 16 чалавек, хор чыгуначнікаў у складзе 35 чалавек, струнны гурток чыгуначнікаў у складзе 15 чалавек і інш.

Вялікія канцэрты з удзелам прафесіянальных артыстаў і мастацкай самадзейнасці адбудуцца ў дні гадавіны і ў радзе іншых гарадоў заходніх абласцей БССР.

І. ПРАУДЗІН.

КАНЦЭРТЫ ДА СВЯТА

Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР рэкамендавала канцэртным калектывам да выканання ў дні гадавіны рад лепшых твораў беларускіх совецкіх кампазітараў, прысвечаных вызваленню Заходняй Беларусі ад белапольскіх акупантаў. Сярод гэтых твораў — тры песні засл. дзеяча мастацтваў БССР А. Туранкова: «Свайму народу» на тэкст народнага паэта БССР Якуба Коласа, «Братам Заходняй Беларусі» на тэкст Г. Няхая і «Вітанне сёстрам і братам» на тэкст Э. Агняцвет; песня засл. дзеяча мастацтваў БССР Е. Цікоцкага «Заходнім беларусам» на тэкст П. Броўкі; «Песня Чырвоных палкоў» засл. арт. рэсп. І. Любана на тэкст В. Лугаўскога; «Родным братам» С. Палонскага на тэкст П. Глебкі; рад песень Аладава, Папова, Іванова, Ефімава, Падкавырава, Лукаса і іншых. Апрача таго, рэкамендавана да выканання сімфонія Цікоцкага, сімфонія «Вызваленне» Залатарова, квартэт Аладава, паэма «Вызваленне» Столава і інш.

* * *

10 верасня ў Вялікім ордэна Леніна Дзяржаўным тэатры оперы і балета БССР адкрыецца выстаўка праектаў помніка вызваліцельніцы Заходняй Беларусі — Чырвонай Арміі, які будзе ўстаноўлен у Беластоку. У выстаўцы прымаюць удзел вядомыя скульптары Масквы і Ленінграда т.т. Манізер, Матавілаў, Томскі, скульптары БССР — заслужаныя дзеячы мастацтваў Керзін, Грубэ, Бразер, скульптары Рапапорт, Глебаў, Арлоў і рад іншых.

* * *

З шырокай праграмай, прысвечанай гадавіне вызвалення Заходняй Беларусі, выступае Белрадыёкамітэт. Дзесяткі тысяч радыёслухачоў пад кіраваннем хормейстраў радыёкамітэта развучваюць новыя песні, прысвечаныя гадавіне.

Пачынаючы з 7 верасня, праводзіцца радыёагляд мастацкай самадзейнасці заходніх абласцей. Лепшыя ўдзельнікі агляду выступяць 17 верасня ў вялікім заключным канцэрце, прысвечаным гадавіне.

Арганізуюцца выступленне выдатнікаў вучобы музычных школ і вучылішчаў заходніх абласцей БССР, канцэрт з твораў совецкіх кампазітараў, прысвечаны гадавіне з'еднання беларускага народа, выступленне артыстаў і калектываў Беластоцкай Дзяржаўнай філармоніі і г. д.

16 верасня адбудзецца канцэрт 4-х гарадоў: Мінска, Кіева, Беластока і Львова. У канцэрце будуць выкананы творы, спецыяльна заказаныя кампазітарам. Сярод гэтых твораў — паэма «Вызваленне» Е. Цікоцкага для сімфанічнага аркестра, хора, салістаў і чытальнікаў.

Таксама ўпершыню будуць выкананы 10 песень Заходняй Беларусі ў апрацоўцы кампазітара Н. Шчэглова для салістаў і сімфанічнага аркестра. Да ўдзелу ў гэтым канцэрце прыцягнуты вядучыя артысты опернага тэатра.

Рад канцэртаў будзе дадзен па заяўках працоўных заходніх абласцей БССР.

* * *

17 верасня ў першым аддзяленні вялікага святочнага канцэрта выступяць артысты Літоўскай ССР па трансляцыі з горада Вільнюса. У гэтым выступленні прымуць удзел народны хор пад кіраваннем Марціноніса, вядомы піяніст Станіслаў Шпінальскі і спявачка Ольга Ольгіна. У праграму канцэрта ўваходзяць літоўскія народныя песні і творы літоўскіх кампазітараў.

* * *

Апрача канцэртаў, будзе перададзен па радыё рад літаратурных матэрыялаў, прысвечаных гістарычнай гадавіне.

Ля мікрафона выступяць пісьменнікі заходніх абласцей БССР.

Некалькі літаратурна-музыкальных перадач будзе прысвечана вызваліцельніцы працоўных Заходняй Беларусі — нашай слаўнай Чырвонай Арміі.

Уся шматтысячная армія работнікаў мастацтваў і ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці БССР з радасцю і энтузіязмам рыхтуецца разам з усімі працоўнымі Совецкай Беларусі шырока адсвяткаваць гістарычную гадавіну вызвалення Заходняй Беларусі ад белапольскіх акупантаў.

Кнігі к гадавіне

К першай гадавіне вызвалення Заходняй Беларусі з-пад панскага прыгнёту Дзяржаўнае выдавецтва пры СНК БССР выдае рад мастацкіх кніг.

З друку ўжо выйшла кніга вершаў маладой паэтэсы заходніх абласцей БССР Ніны Тарас «На ўсход ідучы». У ёй дваццаць тры вершы, напісаныя паэтэсай за чатыры апошнія годы, сярод якіх «Таварышу Сталіну», «Мая песня», «За кудзеляй», «На ўсход ідучы» і інш. Рэдактар кнігі—М. Клімковіч.

Гэтымі днямі выходзіць з друку кніжка выбраных вершаў выдатнага беларускага паэта заходніх абласцей БССР Максіма Танка.

Падпісана да друку кніга апавяданняў польскай пісьменніцы Елены Сэльм «Дзень учарашні» у перакладзе на беларускую мову М. Байкова.

Друкуецца кніжка вершаў «На варце» Філіпа Пестрака—дэпутата Вярхоўнага Совета СССР. У кніжцы сабрана большая частка вершаў, напісаных Пестраком за 11 год пакутвання ў турмах былой панскай Польшчы.

Днямі заканчваецца друкаваннем кніжка апавяданняў пра Заходнюю Беларусь М. Лынькова—«Сустрэчы».

Па дзіцячаму сектару ДВБ выходзяць з друку: паэма З. Бядулі «Хлопчык з-пад Гродна», аповесць М. Лынькова «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышоў», раман «Паўстанне» М. Паслядовіча і «Казка пра мядзведзя» М. Танка.

Абавязацельствы трэба выпаўняць

Спачатку прыгадаем некалькі дакументаў:

«Бяру на сябе абавязацельства дапамагаць у парадку шэфства ў практычнай рабоце драмкалектыву фабрыкі імені Крупскай. Абавязваюся наведваць акуратна два разы ў месяц. Ю. Арончык».

«Бяру на сябе абавязацельства ў парадку шэфства аказваць рэгулярна дапамогу мастацкім самадзейным калектывам пры Мінскім клубе металістаў. І. Балоцін».

«Бяру на сябе абавязацельства ўсяляк дапамагаць Гомельскаму танцавальнаму калектыву клуба імені Леніна. Абавязваюся выязджаць два разы ў месяц. К. Мулер».

Такіх-жа дакументаў, у розных варыянтах, але на адну і тую-ж тэму, можна налічыць яшчэ дзесяткі два-тры. Яны напісаны не ўчора, і нават не месяц таму назад. Гэтыя дакументы датыраваны студзенем і лютым 1939 года — у тыя дні, калі па ўсёй краіне прагучаў заклік народных артыстаў СССР т. т. Масквіна і Барсавай аб шэфстве майстроў мастацтваў над мастацкай самадзейнасцю.

З таго часу прайшло паўтара года. За гэты час дзесяткі і сотні калектываў мастацкай самадзейнасці Масквы, Ленінграда, Кіева і іншых гарадоў значна выраслі, творча ўзмацнелі дзякуючы сістэматычнай сувязі з сваімі шэфамі — майстрамі мастацтваў.

Нажаль, гэтага нельга сказаць аб ролі шэфаў у росце самадзейных гурткоў Мінска і другіх гарадоў рэспублікі. Абавязацельствы, згаданыя вышэй, дагэтуль не выкананы. Гурткі, як і паўтара года таму назад, усё яшчэ чакаюць сваіх шэфаў, з якіх вельмі многія не зрабілі нават першага візіта.

Работнікі мастацтваў гор. Мінска адгукнуліся на заклік т. т. Масквіна і Барсавай, але адгукнуліся фармальна. Падпісаўшы абавязацельствы, яны на другі-ж дзень забыліся пра іх.

Праўда, сярод шэфаў ёсць значная група таварышоў, якія паспяхова распачалі шэфскую работу, аказалі гурткам значную дапамогу. Народны артыст БССР тав. Уладамірскі некалькі разоў выязджаў у Бабруйск, кансультыраваў драмкалектыў лесакамбіната. Засл. арт. рэсп. тав. Зораў, вельмі цёпла сустрэты гуртоўцамі Мінскага клуба металістаў, правёў некалькі гутарак, прысутнічаў на рэпетыцыях, засл. артысты рэспублікі Платонаў, Ржэцкая, Сокал, Моін, артыст яўрэйскага тэатра Каган, дацэнт кансерваторыі тав. Рыбкін, музыкант тав. Рабіновіч і іншыя правялі пэўную работу ў гуртках самадзейнасці.

Але паступова і гэтыя шэфы забываюць дарогу ў падшэфныя калектывы.

Між тым калектывы мастацкай самадзейнасці адчуваюць цяпер асабліва вострую патрэбу ў дапамозе прафесіянальнага мастацтва, бо, паводле рашэння пленума ВЦСПС, кіраванне гурткамі мастацкай самадзейнасці ажыццяўляецца на грамадскіх пачатках. Да кіравання мастацкай самадзейнасцю прыйшлі выраслыя ў самым асяроддзі ўдзельнікаў мастацкіх гурткоў маладыя, яшчэ не даволі вопытныя, кадры. З вялікай нецярплівасцю чакаюць яны практычнай дапамогі ад сваіх шэфаў.

Разам з тым, вопыт шэфскай работы настойліва патрабуе перагляду парадку выбару кожным шэфам падшэфнага калектыва. Няма ніякай патрэбы арганізоўваць шэфскую работу майстроў мастацтваў над калектывамі мастацкай самадзейнасці, якія знаходзяцца на тэрыторыі іншых раёнаў і гарадоў. Тым больш, што за апошнія годы сетка прадпрыемстваў мастацтваў значна вырасла і папоўнілася кваліфіцыраванымі кадрамі, здольнымі самастойна аказваць шэфскую дапамогу калектывам мастацкай самадзейнасці на месцы.

Неабходна ў бліжэйшыя-ж дні абмеркаваць гэта пытанне з работнікамі мастацтваў і прафарганізацыямі з тым, каб на падставе набытага станоўчага вопыту перагледзець арганізацыю шэфскай работы.

Праз тры месяцы пачнецца першы тур усесаюзнага агляду тэатральнай самадзейнасці. Драмкалектывы працуюць над новым рэпертуарам. Цяпер асабліва важна і своечасова даць ім неабходную кансультацыю, —у выбары рэпертуару, у размеркаванні ролей, у раскрыцці вобразаў, ідэі п'есы, у афармленні спектакля, у вучэбна-выхаваўчай рабоце вакол спектакля.

Работнікі мастацтваў павінны з гонарам выпаўніць свой грамадскі абавязак і аказаць калектывам самадзейнасці творчую шэфскую дапамогу.

Г. РУБЕНЧЫК.
Дырэктар Дома народнай творчасці БССР.

Шэфскі канцэрт

Брыгада артыстаў Белдзяржэстрады дала 4 верасня ў Мінскім ваенным шпіталі, шэфскі канцэрт.

У канцэрце прынялі ўдзел: Нікалай Куспінскі, Сямён Розанаў, Фіш, вакалістка Вдавенка, танцоры Нусенбаўм і Нейфельд, а таксама джаз-гол пад кіраваннем Юранда. Канцэрт прайшоў з вялікім поспехам.

Найбольшую ўвагу заслужылі джаз-гол пад кіраваннем Юранда, акрабат Фіш і спявачка Вдавенка.

За чуласць і выдатнае выкананне ўсяму складу артыстаў ад камандвання шпіталя выказана падзяка.

Старшы палітрук Г. САЗОНАЎ.



Вілейскі абласны Дом народнай творчасці падрыхтоўвае мастацкую выстаўку, прысвечаную дасягненням вобласці за год савецкай улады. **На здымку:** семінар мастакоў-самавучак, рыхтуючых карціны к выстаўцы. Справа кіраўнік семінара — мастак Б. Я. Залкінд. Фота В. Гарбачова (БЕЛТА).

РАСТУЦЬ ТАЛЕНТЫ

Ён прайшоў 20 вёрст пехатой у дождж. Змокшы, стомлены, ён спыніў першага прахожага і баязліва спытаўся:

— Таварыш, дзе тут у Вілейцы такая ўстанова, дзе мастакам дапамагаюць у працы?

У руках хлапчук беражліва трымаў нейкі скрутак, старанна ўвязаны ў газетную паперу. Ён абярагаў гэты скрутак ад дажджавых кропель.

— Табе, відаць, Дом народнай творчасці патрэбен? Ідзі на вуліцу Валап'янава.

— Так, Дом народнай творчасці, — радасна падхапіў пастух з вёскі Сачаўкі — Карл Навойчык. Ён ужо даўно захапляўся рысаваннем і нават у полі, калі гапяў кароў, браў з сабою паперу, алоўак і рысаваў.

— Малайчына, Карл. Ты аднясі ў Вілейку свае рысункі, там цяпер дапамагаюць вясковым мастакам.

Гэта думка глыбока запала ў сэрца юнака і, нарысаваўшы першую сюжэтную карціну на тэму «Вызваленне», ён аднёс яе ў вілейскі Дом народнай творчасці на кансультацыю мастаку Залкінду.

Карл Навойчык не першы хадок з вёскі ў Дом народнай творчасці. Амаль штодзённа ў Вілейку, на вуліцу Валап'янава, прыносяць рысункі, лепныя работы, разьбу, прысылаюць п'есы (п'есу «Бальшавік» прыслаў нязнаўна малады аўтар Бахір), заходзяць даведвацца, як паступіць у гурток спеваў, як навучыцца танцаваць, ці прымаюць у драматычны гурток!

Дому народнай творчасці перададзен цудоўны будынак, які калісьці належаў афіцэрскаму сабранню, з залам на 400 месц, з вялікай колькасцю пакояў для гуртковай работы. Пастаяннага тэатра Вілейка, нажаль, яшчэ не мае і народная творчасць, гурткі самадзейнасці тут у некаторай ступені замяняюць так неабходнае для абласнога цэнтра прафесіянальнае мастацтва. Ні адзін вялікі сход не абыходзіцца без шырокай, прадуманай і цікавай праграмы самадзейнасці. Першая вілейская абласная алімпіяда дапамагла выявіць здольных людзей у Глыбокім, Смаргоні, Дзісне, Шаркаўшчыне, Свіры.

Вілейскі Дом народнай творчасці існуе дзевяты месяц. Само сабою зразумела, што ўсю работу яму прыйшлося пачынаць у новых умовах, без усякага вопыту, бо да 17 верасня такая ўстанова, як Дом народнай творчасці, нават у марах была немагчымай на Вілейшчыне... А якая вялікая цяга народа к мастацтву, якая безліч талентаў у беларускім народзе, гэта паказаў першы ўжо месяц работы гэтай незвычайнай ва ўмовах ранейшай Вілейкі ўстановы. З усіх куткоў вобласці ў новаадкрыты Дом творчасці сыпаліся фальклорныя запісы, рысункі, заявы з просьбай стварыць мастацкія гурткі.

Выяўленчае мастацтва займае вялікае месца ў вілейскім Доме народнай творчасці. Праўда, многія сабраныя рысункі яшчэ недасканалыя, але-ж іх пішуць не прафесіянальныя мастакі, а хатнія гаспадыні, школьнікі, міліцыянеры, настаўнікі. 18-гадовая Мешкуць з Ашмян прадставіла эскіз да карціны «Пасяджэнне сельсовета». Гэта работа выйшла ў яе пранікнёнай і добрай, кожная асоба выпісана з уласцівымі ёй індывідуальнымі рысамі, са сваімі асаблівасцямі, а ў цэлым эскіз пакідае ўражанне прадуманасці, умення пабудаваць сюжэт.

І такіх работ нямала атрымлівае Дом народнай творчасці.

Зараз рыхтуецца юбілейная выстаўка к 17 верасня. У ёй прымуць удзел 110 мастакоў-самавучак. Гэта не мала... Праўда, тут не толькі мастакі, але і разьбяры па дрэву, вышывальшчыцы.

Дом народнай творчасці адначасова спрые росту прафесіянальных мастакоў. Выпускнік Парыжскай акадэміі вілейскі мастак Залкінд за апошні час напісаў вельмі цікавыя жывапісныя работы, дзісненскі мастак Шчырбула прыслаў дзве новыя карціны на тэму «Куток невялікага горада».

У гарадах вобласці, асабліва ў Глыбокім, з вялікай прадукцыйнасцю працуюць драмгурткі. Такі гурток створан у самай Вілейцы. Зусім зразумела, што першую сваю работу малады драмгурток хоча прысвяціць 17-му верасня. Гурток ставіць п'есу «Шчаслівая восень» — пра шчаслівую восень 1939 года.

Жыццёва праявілі сябе музычныя гурткі, і цяпер упершыню ў гісторыі Вілейкі пачынае працаваць пастаянная музычная школа. Гэта нябачаная тут з'ява: музычная школа з бясплатным навучаннем!..

На тры месяцы з усіх заходніх абласцей БССР у Вілейку прыехалі будучыя кіраўнікі танцавальных самадзейных гурткоў. Іх навучае мінскі балетмейстар Лінэвіч.

Дом на вуліцы Валап'янава нездарма прыцягвае ўвагу працоўных Вілейшчыны. Развяволеныя таленты народа пышна расцвілі на свабоднай зямлі.

Е. САДОЎСКІ.

ГІМН ПЕРАМОЖЦАМ

Дзікая, неўтаймоўная Поўнач. Тысячагоддзямі змагаюцца з яе стыхіяй маленькія істоты — людзі, тысячы і тысячы іх гінуць сярод ільдзяных велізнаў-торасаў. Але вось прыходзяць бальшэвікі і перамагаюць яе. Поўнач, забыўшы сваю шматвяковую непакорлівасць людзям, схіляецца перад імі і здаецца на літасць пераможцаў.

Такая асноўная тэма апавяданняў адаронага пісьменніка, удзельніка чэлюскінскай эпапеі Аляксандра Міронава, сабраных у кніжцы «Большое сердце» (ГІЗБел, 1939).

Бушуе шторм. Маленькі бот «Хрысціне» заціснут ільдамі, раздушан, як арэхавая шкарлупіна, і гіне, цягнучы з сабою на дно сонных матросаў. У жывых застаюцца толькі трое: капітан, радыст і вахценны. Радыёграма аб дапамозе ў Нарвегіі безумоўна атрымана, але і радыст і астатнія ведаюць, што дапамогі ім не дадуць. Суднаўласнік не захоча рызыкаваць дзеля іх у такі шторм. Радыст скончыў жыццё самагубствам. Двое застаюцца жыць. Дзень, два, тры, пяць... Яны з'елі свае пімы і кажушкі, яны накінуліся адзін на другога, як звяры, і... апынуліся ў светлай і цёплай каюце савецкага ледакола, які выратаваў іх.

Такі кароткі змест апавядання «Ля берагоў Грэнландыі». У гэтым апавяданні аўтар сцвярджае, якая вялікая любоў савецкіх людзей да чалавецтва: у імя выратавання жыцця трох чалавек савецкія маракі выйшлі на барацьбу з бушуючай стыхіяй і перамаглі. Непахіснасць, воля да перамогі, любоў к чалавеку і рызыка дзеля яго выратавання — рысы, якія характарызуюць новага чалавека-пераможца, савецкага чалавека.

У апавяданні «На зімоўцы» аўтар знаёміць чытачоў з умовамі жыцця зімоўшчыкаў, з усім тым, што яны перажываюць, якіх цяжкасцей і нягод каштуе ім навуковая работа па пакарэнню Арктыкі. З зімоўшчыкамі знаходзіцца хлопчык Сярожа. Ён сур'ёзна захварэў. Гэта хвароба вялікім цяжарам легла на зімоўшчыкаў, душыць іх, прыгнятае. Яны могуць папрасіць дапамогі, але надвор'е вельмі дрэннае і выклікаць самалёт у такое надвор'е нельга: у ім-жа таксама людзі і яны могуць загінуць.

І бацька, і маці Сярожы, і ўсе зімоўшчыкі моўчкі перажываюць пакуты дзіцяці, па чарзе дзяжураць ля яго ложка. Начальнік зімоўкі Васільеў у часе чарговай «гутаркі» з востравам Дэіксан паведаміў аб хваробе сына Сярожы. Не, дапамогі ён не прасіў, ён толькі падзяліўся сваім горам.

Аднак, савецкія людзі лічаць сваім абавязкам дапамогу братам і прыяцелям. Дапамогі ў іх не прасілі, але дапамагчы яны абавязаны. І вось, у той момант, калі пагроза смерці Сярожы цяжкай хмарай навісае над зімоўшчыкамі, прылятае самалёт і прывозіць доктара.

Як і ў першым апавяданні, звязваючай ніццю тут з'яўляецца любоў і дружба, абавязак савецкага чалавека перад сваімі братамі, барацьба і рызыка ў імя выратавання чалавечага жыцця.

Але не толькі тэмы апісання далёкай Поўначы цікавяць тав. Міронава. Ён закранае і вялікія псіхалагічныя перажыванні чалавека.

Так, у апавяданні «Вялікае сэрца» артыстка Гараніна пакутуе ад няведання пра лёс свайго сына — лапцёўца Аляксея. Сёння яна павінна іграць адказную ролю, а ад сына няма вестак. Адкуль-жа ўзяць радасць і натхненне? Але іграць яна павінна, і іграць добра. Перад спектаклем людзі, якія ведаюць аб гібелі «Лапцева», сваімі паводзінамі прымушаюць Гараніну ўспомніць пра сына. Яна здагадваецца, пачынае разумець, што адбылося нешта страшнае і яно датычыць яе. Нарэшце, яна зразумела ўсё. Сваё гора, свае перажыванні, перажыванні маці, ўкладае яна ў выконваемую ролю. Яе закідваюць кветкамі, абнімаюць, цалуюць, бо так яшчэ ніхто не выконваў ролі!

Такім чынам асабістае гора маці, увасобленае ў мастацтва, сіла волі і любоў да людзей дапамаглі Гаранінай атрымаць буйную перамогу на сцэне. Такім чынам аўтар здолеў паказаць жаль і боль вялікага чалавечага сэрца, яго любоў і к сыну, і к народу, і к прыяцелям, здолеў паказаць адзіную ніць, якая звязвае асабістае «я» з грамадскімі інтарэсамі.

Для творчасці А. Міронава характэрна тое, што без прэтэнзій на арыгінальнасць тэмы ён умее раскрыць перад чытачом зусім новыя, незнаёмыя рысы людзей, прыроды, узаемаадносін паміж людзьмі. Сітуацыі вострыя, мова мяккая і простая. Не гледзячы на скупасць і прастату мовы, тав. Міронаў у кожным сваім апавяданні трымае чытача ў напружанні да канца. Героі яго апавяданняў жывуць, рухаюцца, любяць і ненавідзяць, чытач неадлучна следуе за імі і яму здаецца, што ў гэтых апавяданнях героем быў ён сам.

Канец кожнага апавядання А. Міронава навелістычны, нечаканы для чытача. Возьмем, напрыклад, апавяданне «На зімоўцы». Пасля таго, як Васільеў «пагутарыў» з востравам Дэіксан і «неасцярожна» падзяліўся горам зімоўшчыкаў, узышло сонца і Сярожу стала нібы лягчэй. Але гэта было не к дабру.

«Сярожа змоўк. Кожнае слова патрабавала намаганняў. З мінуты на мінуту зімоўшчыкі чакалі, што кволае цельца хлопчыка сударгава выцягнецца на ложку. Ён ляжаў худы, зжаўцелы, празрысты. Жыццё свяцілася толькі ў шырока адкрытых вачах, поўных болю і неўразумення. Вочы блукалі па тварах зімоўшчыкаў і як-бы прасілі аб дапамозе.

Па вакну, накрытаму ільдом, знізу, ад падваконніка, папоўз уверх сіні цень: сонца рыхтавалася схавацца ў лёд. Усім здалося, што яно абавязкова забярэ Сярожу, Малыгін сударгава ўстрапянуўся, нібы хацеў утрымаць сонца.

— Мамуля, — раптам выразна, гучна сказаў хлопчык. — Чуеш, гудзе?


— Усё, — падумаў Васільеў. — Канец...

І раптам вялікім прыжком ён выскачыў з пакоя, праляцеў па калідоры і з размаху высадзіў дзверы нагой на двор. З-за сонца, ззяючы золатам крылляў, к востраву ляцеў, магутна равучы матoрам, самалёт!!!»

Карціна сапраўды напружаная і выражаецца некалькімі ўдалымі штрыхамі, зусім нечаканымі для чытача.

У некалькіх радках зусім немагчыма спыніцца падрабязна на вельмі цікавых дэталях апавяданняў тав. Міронава. Але і сказанае пра іх і тое пазнавальнае значэнне, якое яны маюць, ярка паказваючы малавядомую Поўнач, дае нам права сцвярджаць, што невялікая і цікавая кніжка А. Міронава незаслужана абыйдзена беларускай крытыкай.

К. ЦІТОЎ.



На радзіме «Джангара». Цэнтр Калмыцкай АССР—Эліста (від з самалёта). Фота Л. Велікжаніна (ТАСС).

Ніна Тарас

ЗАПІШЫЦЕ СЫНА Ў КОМСАМОЛ

— Ты адкуль, стары, прыплёўся? Ну, садзіся.
...Ён нясмела падышоў к сталу.
(Можа, лапці ў дарозе расплыліся,
Мо' стаптаў, схіліўшыся на плуг?)

— Часу, бачыце, няма: жніво, работа...
Сеў і шапку палажыў на стол.
І расказваў — працаваць цяпер ахвота,
І прасіў — прыміце сына ў комсамол.

— Я
не мала пратаптаў трапінак
І чужых загонаў узвярнуў.
Ды і старасць згорбіла мне спіну,
І ад працы пальцаў не сагну.
А цяпер жыццё — і слоў не маю —
Нейк парадкам укладаецца само:
Дочку ў трактарысты пасылаю,
Сына... запішыце ў комсамол.

А калі жыццё мяне пакіне,
Бо цяжаюць перажытыя гады —
Застанецца верны ён краіне
І калгасным нівам маладым.

Тут прыпомніў, як на ніве на шырокай
Густа, густа выраслі снапы,
Як у горад з вёскі ён далёкай
Ледзь прыплёўся праз гарачы пыл.

І што толькі аб адным ён марыць,
Каб дабрацца як туды — на ўсход,
І падзякаваць за светлую за старасць
І за першы ураджайны год.

І хацеў аб даўніх аб хвілінах,
Аб жыцці мінулым расказаць,
Да з вачэй адцвіўшых па маршчынах
Паплыла няхочучы сляза.

Але гутарку дакончыў, як баладу,
Што служыць краіне хоча сын.
І панёс ён зноў дадому радасць
Праз гарачы пыл і праз лясы.

М. Ліфшыц

ЯК НАРАДЖАЕЦЦА ПЕСНЯ


Так вось песня на свеце ўзнікае,
Пачынае матыў існаваць:
У самоце адзін заспявае,
Каб дакучлівы сум адагнаць.

А праходзіць другі тою сцежкай—
Не схаваць яму смутку свайго —
А пачуе той спеў
і усмешкай
Ўраз засвеціцца погляд яго.

Гэтым часам з далёкага марша
Крочыць шляхам шырокім атрад.
— Хлопцы! Чуеце, песня-ж то наша!—
І смяюцца.
І кожны ёй рад.
І той спеў над сабой узнімаюць,
І высока праносяць,
як сцяг.
Галасы у грудзях закіпаюць,
Песня шырай плыве у прасцяг.

Шлях да шляха,
Дарога к дарозе —
Рэха шырыцца,
далі пяюць.

З гэтай песняй на бітву выходзяць,
З гэтай песняй ў атаку ідуць.
Згіне ў байцы адзін —
за героя
На тым месцы другі устае.
І не знішчыць пявучай той зброі—
Ты забі —
Яна зноўку жыве.



Па Заходніх абласцях БССР. Брэсцкі гарадскі тэатр. Фота В. Лупейка. (БЕЛТА).

Як я ўкладаю спаць свайго сына

Цёплы цвет сыпяць дрэвы. Такую
Ты ці бачыў вясну над зямлёй.
Спі, мой сынку, я сон твой вартую,
Уся краіна над люлькай тваёй.
Хуткі конь, як віхор ашалелы,
Праз даліны і горы імчыць.
Ён сумуе па конніку смелым—
Майму сынку тым коннікам быць.
Бачу, вёрсты ляцяць за табою...
Ціхім спевам цябе абніму.
Спі, закрый свае вочкі, малое,
Я зайздрошчу табе аднаму.

З яўрэйскай мовы пераклаў
А. ЖАЎРУК.

Абмеркаванне новых твораў

Лірычны штамп

★ **А. Кучар** ★

Пятро Глебка надрукаваў у № 24 газеты «Літаратура і мастацтва» за 1940 год артыкул аб новых вершах Петруся Броўкі.

У гэтым артыкуле тав. Глебка паўтарае некалькі даволі бясспрэчных ісцін. Ён, напрыклад, растлумачвае, што асновай літаратуры з'яўляюцца пачуцці людзей і што не толькі ў эпічных, а і ў вузка-лірычных творах прысутнічаюць пачуцці чалавека, альбо «ледзь прыкметны рух пачуццяў».

Усё гэта бясспрэчна і вядома. Але выходзячы з гэтага і знаходзячы «ледзь прыкметны рух пачуццяў» у апошніх вершах П. Броўкі, тав. Глебка робіць вывад, што яны ўяўляюць лепшае сярод твораў паэта, тое, што называецца «крокам наперад» у нашай літаратуры. Разам з тым тав. Глебка нападае на Г. Бярозкіна за тое, што тав. Бярозкін лічыць творы П. Броўкі так званага «інтанацыйнага складу» (такія, як «Праз горы і стэп») больш моцнымі ў параўнанні з апошнімі яго вершамі: «Мяцеліца», «Маланка», «Мы з табой хадзілі часта ў поле», «Гэты кветкамі-пухам абсыпаны сад» і інш.

Вось, коратка, сутнасць пакуль-што не разгарнуўшайся яшчэ спрэчкі.

Мы асмельваемся ўмяшацца ў яе, паколькі, як нам здаецца, артыкул тав. Глебкі дае матэрыял для пастаноўкі, праўда, зусім у іншым плане, пытання аб шляхах развіцця нашай паэзіі.

У савецкай паэзіі апошніх год вельмі часта сустракаюцца настроі благадушнасці, настроі бяспечнасці. Больш усяго пераважаюць творы саладжавыя, у якіх трошкі аб летнім вечары, трошкі аб каханні, і ўсё гэта прасякнута ўяўнай глыбакадумнасцю.

У модзе іранічны верш аб сімпатычным трактарысту, вельмі пяспрытным у справах кахання, аб дзяўчыне, якая не ведае, як выказаць свае пачуцці, аб яе прызнанні таму, хто гэтага зусім не чакаў, аб старых дзядах-дзіваках, аб пчолах і пчалярах, аб садоўніках.

Асабліва значнае месца займаюць тут творы А. Твардоўскага.

З другога боку, паявілася шмат твораў уяўна-філасафічных. Такі сучасны Гётэ глядзіць на дрэвавы ліст, на куст травы і робіць, як яму здаецца, вывады, што маюць дачыненне на крайняй меры да ўсяго космасу. Тут найбольш праявіўся паэт С. Шчыпачоў.

Калі-ж нават і пішацца твор на гераічную тэму, дык з абавязковым упорам на сантыментальнасць, на залішнюю пачуццёвасць.

Няправільна было-б сцвярджаць, што сярод нашых паэтычных твораў не сустракаюцца творы глыбокія па думцы і пачуццю, авеяныя сапраўднай паэзіяй, прасякнутыя разуменнем самых складаных адценняў у пачуццях людзей і ў прыродзе. Але справа ў тым, што адны і тыя матывы вельмі часта паўтараюцца ў многіх паэтаў. І не толькі таму, што паэты запазычваюць адзін у другога, а таму, што рэцэпт прыгатавання такіх вершаў стаў агульнавядомым: крыху аптымізму, крыху суму, погляд каханай, дэталь з маленства, прырода — і верш гатоў.

Паўтараем, часам паводле гэтага рэцэпту робяцца нядрэнныя вершы, але яны не вызначаюцца той арыгінальнасцю і непаўторнасцю, якія і ёсць адзнака сапраўднай паэзіі.

Па-другое, і самае галоўнае, у вершах такой катэгорыі, нават зусім самастойных, не адчуваецца часу, у якім жывуць паэты. Будучы патомак са здзіўленнем будзе адносіць гэтыя вершы да 40-х год XX стагоддзя, год, у якія ішла грандыёзнейшая творчая работа па будаўніцтву комуністычнага грамадства ў СССР, па ўмацаванню абараназдольнасці нашай радзімы, па мабілізацыі баявой гатоўнасці нашага народа. Не пазнае наш далёкі патомак, калі толькі гэтыя вершы да яго дойдуць, і таго, што яны ствараліся ў абставінах 2-й імперыялістычнай вайны, якая ахапіла поўсвету, да таго бесклапотнымі з'яўляюцца вершы некаторых нашых паэтаў. А савецкім паэтам трэба часцей паўтараць залатыя словы таварыша Сталіна: «Прыемна і радасна ведаць, што кроў, багата пралітая нашымі людзьмі, не прайшла дарма». Тады яны не будуць пісаць такіх лёгкадумных вершаў. Нядрэнна было-б, каб яны глыбока адчулі словы Маякоўскага аб зямлі, якую паэт «заваяваў» і «полуживую выняньчил».

Апошнія вершы П. Броўкі знаходзяцца на прафесіянальна даволі высокім узроўні, але яны не раскрываюць нам глыбей уласна-броўкаву паэтычную індывідуальнасць і напісаны яны маглі быць і пяць год назад, і тры, і два.

Другі паэт, Аркадзь Куляшоў таксама доўгі час злоўжываў падобнымі творамі, і хаця для творчай індывідуальнасці А. Куляшова яны больш арганічныя, але і ў яго вершах пра «ельнік», «дымок» і «каруселі» — творах прафесіянальна высокага майстэрства, — шмат благадушнасці, крыху сантыментальнасці і мала адчування часу.

Асноўная хіба апошніх вершаў П. Броўкі заключаецца ў тым, што ў іх мала ўласнага паэтавага пачуцця.

Вось адзін з новых вершаў П. Броўкі «Маланка» — аб дзяўчыне, да якой заляцаюцца многія:

Садавод нясе ранеты,
Далявод гарох пасееты,
Я-ж паэмы і санеты.
Маланка-ж — «Шах!.. ды выйшла
за ўдзўпа..»

Падобную сітуацыю, пры якой ніхто загадзя не ведае сапраўдных парываў душы дзяўчыны, мы сустракаем і ў другіх паэтаў, нават у таго-ж Глебкі. У вершы «Прызнанне» таксама «ваююць за дзяўчыну»:

Камандзір высокі танка,
Трактарысты,
Кавалі
Кожны вечар каля ганку
За цябе вайну вялі.

Няўжо ў гэтым выпадку мы маем уплыў аднаго паэта на другога? Не. Далёка да паяўлення Глебкавага верша сам П. Броўка выкарыстаў падобную сітуацыю ў вершах «Вечар», «На полі першая раса», «Здрада». У сваю чаргу, сітуацыя верша «Здрада» — дзяўчына не хоча кахаць калгаснага гультая — потым аказалася ў вершы П. Панчанкі «Размова». Што-ж, і ў гэтым выпадку ўплыў? Не! Паўтараем, справа ў тым, што ўсе паэты добра засвоілі правілы, як трэба «рабіць» такія вершы, і рабілі іх самастойна. Спачатку гэтыя творы здзіўлялі чытача сваёй навізной, а потым прыеліся і перасталі ўплываць на яго.

Паўтараецца адна і тая-ж сітуацыя ў вершы «Скрыпач» П. Броўкі і ў вершы «Музыка» А. Куляшова. І ў аднаго і ў другога музыкант — душа ўсёй вёскі. У адным выпадку сэрца яго пакарыла дзяўчына, у другім — смерць. Ёсць у гэтым вершы П. Броўкі прадуманыя і яркія вобразы, накшталт такіх:

А ён, загадкавы сілач,
Звычаі меў свае —
Абходзіў куст, каб не сагнаць
І птушкі, што пяе.

Альбо:

Бывала,
З саду усяго
(Ён быў вартаўніком)
Паслухаць яблыні яго
Збіраліся кругом.

Але цалкам гэты твор зроблен па рэцэпту, вядомаму ўсім паэтам. І «ледзь прыкметны рух пачуццяў», які ў вершы ёсць, даволі прыкметны і ў другіх паэтаў.

Лёгкадумных, так званых «цывільных» вершаў нямала сярод апошніх твораў П. Броўкі. Гэта вершы, не пазбаўленыя пэўнай паэтычнасці, але на іх няма пячаткі эпохі, часу.

Вось верш «Гэты кветкамі-пухам абсыпаны сад». Паэт заклікае сваю каханую «па пчалінаму шляху свой агледжваць дом».

Сядзем потым спачыць мы пад лістам
адным.
— Згодна ты?
— Ты маўчыш?..
— Паляцім!..
— Паляцім?!

Такой-жа лёгкадумнасцю адзначаюцца і некаторыя аналагічныя вершы А. Куляшова, напрыклад, «Карусель». Розніца толькі ў тым, што ў П. Броўкі зварот да каханай «Палядім!.. Палядім?!», а ў Куляшова: «— Што-ж, пайшлі? — Пайшлі...»

Мала цікавага і арыгінальнага ў такіх вершах П. Броўкі, як «Бор», «Дождж», «Мяцеліца». Тав. Глебка растлумачвае нам, што грозны бор — сімвал змагання. Няхай сабе і так. Але гэты верш нічым новым не дапаўняе даўно вядомага нам у беларускай літаратуры вобраза грознага лесу, як сімвала змагання.

Зямля, усё жывое, якое чакае дажджу, незвычайна адчувальна выпісана ў вершы «Дождж», але і ў гэтым вершы паэтычная індывідуальнасць П. Броўкі не праяўляецца ярка. Што-ж датычыць гукаперайманняў мяцеліцы ў вершы «Мяцеліца», дык гэты прыём яшчэ з часоў М. Багдановіча даволі выпрабаваны ў нашай літаратуры. Паколькі мы ўжо раней сказалі, што хібы, уласцівыя вершам П. Броўкі, характэрны і для многіх другіх паэтаў, укажам на апошнюю нізку вершаў А. Куляшова «Юнацкі свет», надрукаваных у «Полымі рэвалюцыі» № 3 за 1940 год.

Тут адчуванне часу адсутнічае. Лірычная бесклапотнасць характэрна для многіх вершаў гэтай нізкі.

Вось верш «Вуліца Маскоўская»:

Землякі вітаюцца з пашанай,
Ну а я?
Лаўлю сабе ляшча
І хаджу, хаджу дарогай знанай
І слыву,
Слыву за масквіча.
У дуду з цікавасцю маскоўскай
Звонка па-дзіцячаму свішчу...

Такая-ж выключная бесклапотнасць у вершах «Бюро даведак», «Добры чалавек». Але асаблівых памераў яна дасягае ў вершы «Глушцы».

Праблема гэтага верша незвычайна —«глыбокая». Лірычнаму герою верша А. Куляшова калгас даручыў паехаць у млын змалоць збожжа. Але на млыне чарга. Якраз у гэты час герою трэба з сябрам Максімам ісці на глушцоў. І вось яны ўмудрыліся ашукаць чаргу: сказалі, што «Максімава жонка памерла», і людзі дазволілі ім змалоць без чаргі. Але на гэтым гісторыя не канчаецца. Далей іх пачынае мучыць сумленне. І ледзьве не ўвесь абшар шле ім дакор. Нехта трапна адзначыў, што словы:

А жораў рэжа сінь,
Ляціць над плынню рэк,
Крычыць:
Максім, Максім
Прапашчы чалавек, —

нагадваюць Э. Багрыцкага: «Апанасе! Апанасе! Кацюга! Кацюга!» Дык у героя Э. Багрыцкага, Апанаса, сапраўды трагедыя, а тут з дробязі ствараецца «трагедыя».

Нарэшце, калі паэту нехапае адчування часу, дык навошта агортваць вершы ўяўнай праблематычнасцю? У гэтых выпадках трэба даваць чыста лірычны верш. Я асабіста замест уяўна-праблематычных твораў аддаю перавагу лірыцы, што называецца, «на ўсю моц». Мы з большай прыемнасцю чытаем такія цудоўныя творы А. Куляшова, як «Легенда», «Воблака», чым «праблемных» «Глушцоў». Вось пачатак «Легенды»:

З дзеўчынай развітваўся юнак,
Аддаваў яе шляхам, далінам.
—Лепш-бы млынам стаць... падумаў
так,
І зрабіўся на тым месцы млынам.

Такім-жа моцным з'яўляецца сапраўды хрэстаматыйны верш А. Куляшова «Воблака».

Што-ж датычыць апошніх вершаў П. Броўкі, дык лепшыя сярод іх не абстрактна-лірычныя, а прысвечаныя вызваленню Заходняй Беларусі. Тут трэба назваць такія творы, як «Танкісты», «З паходаў», «Сустрэча».

Верш «Танкісты» правільна ахарактарызаван П. Глебкам. У гэтым вершы ёсць адчуванне прыроды, апраўданасць учынкаў людзей. У вершы «З паходаў» вельмі пераканаўча гучаць словы маці аб сыне, які пайшоў сустракаць сваіх вызваліцеляў з чырвонай хусткай, бо не меў з чаго зрабіць сапраўдны сцяг. За гэты сцяг яго забілі жандары.

— За гэту хустку ён памёр...
Гаворыць нам усім.

Байцы адчуваюць глыбокі боль маці і абяцаюць ёй:

Калі пачуеш стрэл здалёк,
Ты ведай —
Нішчым зброд!..
І мы пайшлі на Беласток
Праз вёску Чорны Брод.

У вершы «Магіла» смерць байца асацыіруецца з словамі, якія баец сказаў раней:

За гэты мурожны шаўковы прастор
Гатоў я памерці цяпер.

Пасля смерці байца таварышы ўспа-

У майстэрні І. Е. Рэпіна

★

Юр. Віцьбіч

★

Машына ідзе па Вялікалуцкаму тракту. Віцебск застаўся ззаду, але доўга яшчэ відаць комін «Сцяга індустрыялізацыі». Справа шырока раскінуўся на ўзгорках і лагчынах малады сад калгаса імя Чырвонай Арміі. Злева паказваецца Падбярэзскі лес. За ім бяжыць нябачная адсюль Дзвіна, а над ёй, нібы дзяўчаты над люстрам, схіліліся бярозы і таполі жывапіснай Мядзвежай гары. І чамусьці раптам успамінаецца падобная да стогну песня:

Ой, на той Мядзвежай гары
Падмывае рака тры крыжы.
А пад імі ляжаць бурлакі,
Ой, тутэйшыя ўсё дзецюкі.

Мы едзем туды, дзе калісьці жыў і тварыў вялікі мастак-гуманіст. І маршрут нам добра знаёмы з яго гасціннага пісьма: «Ці не заедзеце да нас у вёску пагасціць папросту? Найпрасцейшы з хутароў.

Ехаць трэба да Віцебска, у Віцебску ўзяць рамізніка да Здраўнёва—2 рублі плата. Язды на кані дзве гадзіны. Дарога ідзе на Барвін (тут паром праз Дзвіну), на Слабаду і Койтава; адсюль вы ўбачыце нашу вежу і хутка даедзеце. Вам усе нашы будуць вельмі рады і я таксама. Ваш Рэпін».

Пераправіўшыся праз раку, хутка даязджаем да сялення Слабада і спыняемся каля вясковых могілак. Тут недзе пахаван Ефім Васільевіч Рэпін. Мастак заўсёды ласкава называў яго «бацenькай», а пра сябе гаварыў: «я-ж мужык, сын адстаўнога радавога, працягнуўшага дваццаць сем не вельмі шчаслівых год нікалаеўскай салдатчыны». І стары нікалаеўскі улан устане перад вамі, як жывы, калі вы пабачыце ў Рускім музеі яго партрэт — адзін з самых удалых і прыгожых па каларыту партрэтаў работы мастака.

Непрыкметны грудок без агарожы і надпісу мы знаходзім з дапамогай далёкага сваяка Рэпіна, настаўніка мясцовай школы. Цэнтр могілак займае фундамент непатрэбнай народу царквы. Калісьці, у адказ на просьбы неадчэпнага пана, Рэпін напісаў для гэтай царквы ікону Хрыста, якая характарызуе сабою тагочасныя адносіны мастака да рэлігіі. Спачатку багамолкі шчыра хрысціліся перад ёю, а потым, больш уважліва разглядзеўшы яе, адразу завойкалі:

— Аво-охці нам! Гэта-ж, даруй божа, рыжы Карла, здраўнёўскі садоўнік. П'яніца, даруй божа, распуснік...

За Слабадой пачынаюцца глыбокія кар'еры Вярхоўскага вапнавага завода. Ужо сорак год работае на ім Макар Зайцаў. У юнацкія гады ён разам з сваёй неадлучнай стрэльбай-дубальтоўкай увекавечан мастаком у радзе эскізаў да эцюда «На паляванні». У баку застаецца калгас імені Чапаева, былая вёска Каралёва. Калі ў засушлівае лета 1893 года яна на працягу адной гадзіны выгарэла, дык на другі дзень пасля пажару прыехаў Рэпін. Ён прывёз прыбітым нечаканым горам пагарэльцам, якія збіраліся ісці ў жабракі, воз печанага хлеба, розную вопратку і сто рублёў грашмі.

Паміж Вярхоўем і Койтавым дарога вельмі звіваецца. Яна спярша падымаецца на ўзвышша і ідзе ўздоўж Трылесінскага бору, а потым спускаецца ўніз да бунтаўлівай у гэтых месцах Дзвіны. І нідзе раней мы не бачылі такога багацця палявых кветак, як тут.

На ўзлессі, па ўзгорках, чырванеецца самасейны мак-відук, над ім схіляюцца жоўтыя пахучыя кісткі залатых розаг, скромныя гарлянкі страсаюць з сваіх фіялетавых кветак кроплі расы на ліловыя венчыкі медуніц. Прасторны луг упрыгожваюць сабою сінія васількі, белыя рамашкі, чырвоныя гвазд зікі. Прыдарожную канаву зрабілі блакітнай незабудкі. І нават на самай дарозе, паміж яе трактарнымі калеінамі, прытуліліся бледна-зялёныя паграмушкі. Гэты цудоўны беларускі кавёр напамінае нам яркасць рэпінскай палітры.

А з правага боку бяжыць і шуміць красуня Дзвіна. На працягу дваццаці кіламетраў ідуць адзін за адным парогі: Лушчыха, Закладзень, Руба, Капачы, Талкачыха.

Сустрэла тут рака шэрыя даламітавыя скалы і шурпатыя гранітныя валуны. Пакрытая белай пенай, яна ўпарта змагаецца з імі. І гэта барацьба напомніла нам смеласць страснага рэпінскага таленту, яго поўную такой-жа ўпартай барацьбы творчасць.

Здраўнёва пачынаецца цяністай хваёвай алеяй. У канцы яе, побач з будынкам пачатковай школы, бачым фундамент. Гэта ўсё, што засталося ад дома з вежай-майстэрняй, у якім з 1892 па 1900 год кожнае лета жыў Рэпін. Пазней тут жылі яго бацька, жонка і дзеці. Тут нарадзіліся праўнучкі мастака, якім ён перад сваёй смерцю пісаў:

«Ах, мае мілыя праўнучкі! Як я шкадую, што мне ўжо не суджана бачыць вас і вам ужо не даехаць сюды! Як шкада! Як шкада!

Ваш прадзед Ілья Рэпін.

10/VI-1930 г. Куокалла».

Просьба мастака была задаволена. Праз тыдзень апошнія з Рэпіных атрымалі візу з подпісам таварыша Менжынскага і пакінулі Здраўнёва. За год перад гэтым ім прыйшлося разабраць дом, які пагражаў падзеннем.

Спярша нам здаецца, што нічога, звязанага з імем Рэпіна, тут цяпер не засталося. Знікла яго вежа-майстэрня. Потым, агледзеўшыся вакол, мы пераконваемся, што так толькі здаецца. Безліч дарагіх успамінаў і знаёмых вобразаў акружаюць нас з усіх бакоў.

На гэтую пляцоўку штогод на Ільін дзень сыходзіліся з блізкіх і далёкіх вёсак сотні сялян, каб павіншаваць вядомага ўсяму свету, але разам з тым такога простага ў абыходжанні з імі імянінніка. На беразе захаваліся сляды каменнай дамбы, якую мастак будаваў для таго, каб даць заработак сялянскай беднаце. Шумяць чатыры высокія дубы, пасаджаныя самім Рэпіным. Пад адным з іх ляжыць высечаны з каменя дубовы ліст.

Вось Здраўнёўскі луг, дзе створан цудоўны партрэт «Асенні букет». Нам успамінаецца чаруючая сваёй маладосцю дзяўчына з букетам у руках, у аліўкавай кофце і карычневым берэце. Яна напісана на фоне гэтага луга і Дзвіны. Вось Пякаўскі роў, які не цяжка пазнаць, убачыўшы славуты партрэт «На сонцы». Вось Здраўнёўскі сад. Нават тыя, хто бачыць яго ўпершыню, усё-ж даўно знаёмы з гэтымі старымі дрэвамі, якія калісьці пазіравалі мастаку для пейзажа «Квітнеючыя яблыні». Вось Сахараўскі бор. Тут нарадзіўся пейзаж «Уход сонца над Заходняй Дзвіной». А вось і парог Закладзень. Залатым ён выглядае ў пейзажы «Месячная ноч».

Мы ў майстэрні Рэпіна. Каб хаця крыху пазнаёміцца з ёю, трэба абыйсці ўсе вакольныя вёскі. Там мастака бачылі амаль штодня з альбомам у руках.

Восем год назад памёр Сцяпан Крывенка, у вобразе якога выдатнейшы мастак, вялікі сын вялікага рускага народа ўяўляў сабе беларуса. Горш за Сцяпана ніхто ў ваколіцы не жыў і ўсё-ж ён быў самым жыццярадасным дзецюком. Варта толькі ўбачыць славуты эцюд «Беларус», каб адразу пераканацца ў гэтым. Усё на ім, за выключэннем вопраткі, належыць Сцяпану: нечасаныя кудры, шырокі лоб, шчырая ўсмешка і нястомныя працавітыя рукі. На адным з эскізаў да эцюда «У хаце» можна ўбачыць яго матку, старую Мар'ю. Яна сядзіць за прасніцай і прадзе кужаль. Аднойчы, праходзячы праз Цякава, мастак заўважыў Ляксея Зайца, які стаяў каля сваёй пахілай хаты ў цяжкім задуменні, апусціўшы рукі, і так яго і напісаў. Цяперашні калгаснік Паўлюк Вераб'ёў пазіраваў у свой час смяротна раненага для карціны «Дуэль». Толькі да здраўнёўскіх карцін «Дуэль» («Даруйце») і «Казанне Кунцэвіча ў Беларусі» Рэпіным напісана больш сарака эскізаў з вакольных сялян.

Мы ў майстэрні Рэпіна. Тут яго сустракалі за працай не толькі ў вёсках, але і на дарогах, у лесе, на беразе ракі. Сустракалі ўдзень, уначы, раніцой, увечары. Ён жыве ў безлічы апавяданняў вакольных калгаснікаў. І здаецца, што гэта аб ім шумяць дубы, што гэта аб ім грыміць Закладзень. Тут усё рашуча напамінае аб ім. І нам мімаволі пачынае здавацца, што спярша мы пачуем лёгкія крокі, а потым убачым нізенькага жвавага старыка з альбомам у руках, з шчырай усмешкай на твары.

Сядзіба Здраўнёва, дзе ўсё сведчыць аб кроўнай сувязі вялікіх братніх народаў— рускага і беларускага, будзе аб'яўлена дзяржаўным культурным запаведнікам. У цэнтры яе ўстановяць помнік-бюст славутаму мастаку. А яго добра ўсім знаёмае імя прысвояць мясцовай школе, у якой цяпер вучацца шчаслівыя ўнукі гарапашніка Ляксея Зайца.

Варочаючыся ў Віцебск, мы неўзаметку даехалі да старога Барвін-Перавоза, аб якім упершыню спамінаецца яшчэ ў сувязі з паходам Івана Грознага. Тут нас затрымліваюць дзед Васіль Карунны і газаход «Акадэмік Паўлаў».

— Пачакайце крыху, таварышы!—кажа дзед. Па зычнаму голасу і высокіх ботах не цяжка пазнаць у ім праваднiка плытоў праз парогі.—Чуў, што вы ездзілі ў Здраўнёва, а я-ж Рэпіна добра ведаў, асабіста з ім сустракаўся. Ідзеш часам на Аўдзеявіцкай дачы і нечакана ўбачыш яго. Сядзіць на паваленай перуном хвоі, рысуючы бярэзіну. Хутка, хутка бегае па паперы алоўкам. І вось ужо дрэва як жывое. Здаецца, вецер на ім галіны гойдае, лісцё трызніць. Помню таксама, як мы на Здраўнёўскім лузе атаву касілі і Рэпін паблізу ад нас працаваў. Перад ім стаіць яго дачка Вера з пукам кветак у руках, а ён з яе карціну малюе. Мы часам спыняліся, каб косы палапаціць, а ён ні разу...

А ці чулі вы, як мы яму дапамагалі? Атрымала яго другая дачка, Таццяна, ад бацькі ні-то ў семнаццатым, ні-то ў васемнаццатым годзе пісьмо. Піша, каб прыслалі яму крыху хлеба, а дзе-ж у той хлеб будзе! Калі пра гэта даведаўся старшыня губрадкома Пяскоўскі, дык адразу сказаў нашаму валаснему старшыні выдзеліць дзесяць пудоў. Галадна тады было. Наш старшыня знайшоў толькі тры пуды. Мы ўжо самі наскраблі па сваіх хатах сем пудоў і паслалі нашаму Ілью Ефімавічу.

«Акадэмік Паўлаў» цягне некалькі лайб. Не трэба здзіўляцца, што ў буксірнага газахода такое імя. Пакідаемыя ім хвалі амываюць прыбярэжную броўку, па якой раней ішлі ад Рыгі да Вяліжа сотні беларускіх Каніных — герояў рэпінскіх «Бурлакоў». Схіліўшыся ў крук, навальваючыся высахлымі грудзьмі на жорсткія лямкі, яны ўпоўголаса спявалі пра крыжы на Мядзвежай гары. Іх рабскую, невыказна цяжкую працу змянілі гэты новыя магутныя савецкія бурлакі, якія працуе так-жа нястомна, як нястомна працаваў славуты савецкі акадэмік. Мы вітаем газаход рукамі, шафёры салютуюць яму гудкамі, дзед Карунны махае шапкай; абапёршыся на веласіпед, усміхаецца дзяўчына. І малады лоцман — магчыма, унук Сцяпана Крывенкі—усміхаючыся ў адказ, круціць штурвал і пяе:

Онегин, я скрывать не стану,
Безумно я люблю Татьяну.

Віцебск, 1940.

Акторы і ролі

★

А. Есакоў

★

Дзяржаўны Рускі драматычны тэатр БССР у новым складзе трупы мае пераважна маладых актораў.

Мы разглядзім асобных выканаўцаў, прымаўшых удзел у розных спектаклях. Да гэтых спектакляў адносіцца камедыя плашча і шпагі Лопе дэ-Вега «Сабака на сене», камедыя прадстаўніка крытычнага рэалізма А. Н. Астроўскага «Таленты і паклоннікі» і п'еса савецкага драматурга Н. Вірты «Загавор», якая выкрывае контррэвалюцыйную дзейнасць трацкісцка-бухарынскіх змоўшчыкаў. Гэтыя спектаклі розныя не толькі па зместу, але і па стылю. Прычым пастаўлены яны рознымі рэжысёрамі. На гэтых спектаклях мы і прасочым творчыя магчымасці калектыва.

Актор-рэаліст турбуецца аб тым, каб больш праўдзіва ўскрыць паказваемы ім вобраз, чым аб тым, каб больш арыгінальна ён выглядаў. Вайстрыня і арыгінальнасць — гэта другарадныя якасці вобраза, падначаленыя праўдзівасці яго дзеяння.

Па гэтаму шляху ішлі акторы А. Перверцэнь і О. Шкапскі ў спектаклі «Загавор».

Мартынаў — самаўпэўнены крохабор, які заблытаўся ў акружаючых абставінах, за плячыма якога ворагі свабодна твараць свае брудныя справы. Ён аказаўся недальнабачным. Ён не ўбачыў варожай дзейнасці нават блізкага яму чалавека — жонкі. Актор А. Перверцэнь усе гэтыя якасці вобраза добра зразумеў. Пашыраючы вобраз, ён дапоўніў яго пазёрствам і прагай да славы, што невыразна было акрэслена драматургам. Узбагаціўшы вобраз асобнымі рысамі псіхалагічных перажыванняў, ён надаў персанажу сапраўднае сцэнічнае жыццё.

Бадай, у гэтым вобразе заключана і ўся каштоўнасць п'есы, якая па сутнасці з'яўляецца творам ілюстрацыйным.

Вобраз сакратара Камянецкага райкома партыі Клепанава своеасабліва вырашан акторам О. Шкапскім. Прытаіўшыйся вораг спрытна маскіраваўся пад партыйнага работніка. Ён здаецца адзічэлым, у ім жыве звярыная душа. Гэты чалавек увесь замкнуўся ў сабе. Ён — заклятны вораг савецкай улады, бухарынец, у сваім крывадушшы агідны і каварны.

Уменне раскрываць асаблівасці закаханай жаночай душы паказала актрыса М. Файбушэвіч у двух ролях — Марсэлы («Сабака на сене») і Смельскай («Таленты і паклоннікі»).

Простая іспанская дзяўчына, служанка графіні Дыяны, страсна закахалася ў маладога чалавека Тэадора. Але непастаянства яе любімага прынесла Марсэле шмат сардэчных пакут. Актрыса паказала шматлікія адценні пачуццяў чалавека. характар якога яшчэ не ўсталяваўся.

Зусім іншы вобраз Смельскай. Астроўскі высмеяў тып прадажнай жанчыны з буржуазнага асяроддзя. Калі вобраз Марсэлы быў лірычны і ўпрыгожваўся дабрадушнай іроніяй, дык вобраз Смельскай часам сатырычан да эксцэнтрычнасці. Поза, манера, вульгарныя паводзіны суправаджаюць усе ўчынкі Смельскай. Яе каханне не праследуе чалавечых пачуццяў, а мае на мэце нажыву. Яна кахае таго, у каго больш грошай. На сцэне і ў жыцці яна пакарае людзей не сваім талентам, а прыгожай знешнасцю. І мастацтва для яе — адна з крыніц яе прыбытку.

Такое вырашэнне двух гэтых вобразаў мы лічым правільным.

Большасць актораў прайшла школу рэалістычнага тэатра, але з прычыны сваёй маладосці не ўсе яны ўстойліва трымаюцца засвоеных прынцыпаў. У многім гэта залежыць і ад рэжысёра, які часам, выкарыстоўваючы малавопытнасць калектыва, збарачвае яго з правільнага шляху на шлях фармалістычных трукаў, прымушаючы актора рабіць вобраз уродліва аднастайным.

Малады рэжысёр В. Мееро ўскі ў камедыі «Сабака на сене» большасць камічных персанажаў трактуе ўтрыравана-шаржыравана. Лопе дэ-Вега дасціпна асмяяў каханкаў Дыяны, не гледзячы на іх знатныя званні. Але пастаноўшчыка гэта не здаволіла, ён вырашыў дапоўніць драматурга. Дапаўненне выйшла не вельмі змястоўным. Так, у сцэне, дзе сустракаюцца каханкі Дыяны— маркіз Рыкардо і граф Федэрыко, пастаноўшчык прымушае выканаўцаў петушыцца адзін перад другім, узнаўляючы нават гнеўнае гагатанне пеўняў. Гэта сцэна зусім не арганічна ў такой жыццёрадаснай камедыі, якой з'яўляецца «Сабака на сене».

Вобраз Рыкардо (арт. Перверцэнь) страціў свой змест з прычыны няправільнай трактоўкі. Драматург, вядома, не меў на мэце высмеяць толькі вонкавыя бакі вобраза гэтага чалавека — яго смешнае ўбранне, ускудлачаную прычоску, да ўродлівасці брыдкі твар. Не, не гэта цікавіла вялікага іспанскага камедыёграфа. Ён высмейваў неразумныя капрызы старога жаніха, яго чапорную гордасць і яго блазенскія паводзіны ў пажылыя годы. Рэжысёр не зразумеў простай мыслі камедыі: старыя захапляюцца маладымі дзяўчатамі, а ў выніку церпяць няўдачу.

Прыгаданыя акалічнасці павінны былі прымусіць выканаўцаў і рэжысёра сур'ёзна прадумаць узаемаадносіны гэтых персанажаў з Дыянай, Тэадорам і астатнімі дзеючымі асобамі камедыі. Але рэжысёр пайшоў па лініі стварэння смеху дзеля смеху. Гэтым і тлумачыцца супастаўленне двух камедыйных персанажаў — нізкага і тоўстага маркіза Рыкардо і хударлявага і высокага графа Федэрыко (арт. Вінаградаў).

Шарж уносіць у рэалістычны спектакль стылістычны разнабой. І дзіўна, як гэтага не адчуваюць пастаноўшчык і акторы.

У спектаклі «Загавор» ёсць персанаж Леон Жанеўскі (арт. Ю. Трохцінберг). Гэта вораг, які маскіруецца пад калгаснага ветэрынара. Увесь сэнс гэтай ролі ў тым, што вораг старанна маскіруецца пад рознымі вопраткамі. Персанаж выпісан у стылі смехатворнага райка. Таму, калі выканаўца пераходзіць да сур'ёзнай гутаркі, гледач не верыць яму. Гэта абставіна выпустошвае змест персанажа.

Захапленне вострымі сітуацыямі, надзвычайным выпукленнем асобных камічных эпізодаў спектакля прыкметна амаль у кожнай пастаноўцы тэатра. Рэжысёр не ўмее рабіць плаўнага пераходу ад драматычных сцэн да камічных. А гэта адбіваецца на ігры актораў.

Гумар Домны Панцялееўны, простай рускай жанчыны, пабудаван Астроўскім на тым, што ўсё сваё шчасце яна бачыць у багацці. Таму яна станоўча адносіцца да Велікатава, які завязваў яе ўвагу купляй бенефіса дачкі, багатым падарункам і апавяданнем аб сваіх добра ўпарадкаваных маёнтках. У такім, прыблізна, плане і іграла гэту ролю артыстка Баркан. Але відаць, што пастаноўшчык увесь час штурхаў актрысу на аднабаковае выкананне, наўмысля імкнучыся паказаць камічныя якасці гэтага вобраза.

Нам здаецца, што рэжысёр не зразумеў жанру твора. У класічным разуменні жанр камедыі заключаўся ў тым, што ў выніку развіцця дзеі ўсе надзеі зводзіліся да шчаслівага канца: зло каралася, дабро перамагала, хоць-бы характар усіх дзей твора быў глыбока драматычным. Так выйшла і ў камедыі «Таленты і паклоннікі». Асновай сюжэту мы лічым не тое нікчэмнае асяроддзе, якое рэзка высмеяў драматург, — гэта фон, — а глыбокія перажыванні актрысы Негінай.

Два вобразы спектакля «Таленты і паклоннікі» — актрыса Негіна і яе жаніх Пётр Мелузаў, малады чалавек, які скончыў курс у універсітэце, — безумоўна з'яўляюцца асноўнымі. Але трактуюцца яны, нажаль, меладраматычна. Таму спектакль замест камедыі ператвараўся ў меладраму.

Замест таго, каб глыбока зразумець пачуцці сваёй гераіні і знайсці тое галоўнае, што з'яўляецца асновай вобраза, актрыса Кавалёва падкрэсліла ў Негінай толькі сантыментальныя пачуцці, чым значна абясцэніла персанаж. Чалавечыя якасці Негінай не ў тым, што яна крапальна ўмее перажываць цяжкасці, а ў тым, што яна мужна перамагае іх.

Артыста Шкапскага ў ролі Мелузава спасцігла няўдача з прычыны таго, што ён таксама павярхоўна зразумеў свой вобраз. Разначынец Пётр, прагрэсіўна мыслячы чалавек, выглядае нікчэмным фразёрам. Яго разумовую перавагу трэба было паказаць не вычурна, а проста, ва ўсёй паўнаце чалавечых якасцей. Багаты матэрыял знайшоў беднае ўвасабленне з прычыны непрадуманасці і адсутнасці творчай фантазіі.

Нам хочацца звярнуць увагу маладога калектыва яшчэ на адзін істотны недахоп, які мае месца ў яго рабоце.

У перыяд трам'аўскага руху была прыдумана славутая «тэорыя»: актор у кожнай ролі павінен іграць самога сябе. Гэту схаластычную догму абверглі само жыццё. Мастацтва не церпіць аднастайнасці, яму чужда таўталогія.

Але, на вялікі жаль, гэта зацвілая тэорыйка у акторскай практыцы яшчэ мае сваіх паслядоўцаў, хоць гэта ўжо радкія экземпляры.

Артыст Шмакаў у разбіраемых спектаклях тры разы паўтарыў сябе і ні разу не стварыў таго вобраза, які неабходны яму па ходу паказваемай п'есы. Персанажы розных эпох — сучасны рабочы МТС Гаўрыла, рускі малады купчык Вася і іспанскі слуга Фабіо аказаліся аднолькавымі. На іх надзеты толькі розныя касцюмы, а пачуцці і характары ў іх аднолькавыя.

Варта адзначыць і другую акалічнасць. Актор Іваноў выконвае ва ўсім рэпертуары бягучага сезона выключна камедыйныя ролі. Іграе ён іх нядрэнна. Адчуваецца, што ён укладвае ў ролі ўсе свае здольнасці. Але мы ведаем тав. Іванова і як выканаўца драматычных ролей (Павел Карчагін у спектаклі «Як гартавалася сталь»), дзе ён сябе таксама паказаў добрым выканаўцам. Ці-ж не значыць гэта, што дыяпазон гэтага выканаўца звужваць няма ніякай патрэбы?

Разбіраючы работу маладых актораў, пераконваешся ў іх плённай працаздольнасці. Гэта прафесіянальны калектыў, які здольны ствараць цікавыя спектаклі.

Сапраўдныя-ж поспехі яшчэ наперадзе. Неабходна штодзённа вучыцца і перш за ўсё на вопыце работы старэйшага пакалення свайго-ж тэатра.

Як вольна валодае камедыйнымі прыёмамі народны артыст БССР ордэнаносец Д. Орлоў у ролі слугі («Сабака на сене»)! Кожная роля павінна быць цэльнай, кампазіцыйна стройнай, максімальна прадуманай. Ці-ж не навучае гэтаму акторская практыка В. Канапляхскага, ствары шага цікавыя вобразы Баландзіна і Велікатава?

Любы вобраз павінен быць жыццёва праўдзівым. Аб гэтым пераканаўча сведчыць роля Мартына Нарокава, бліскуча створаная засл. арт. БССР Н. Аблавым.

Вучоба заўсёды сказваецца праз некаторы час. Дапамагчы вучыцца акторам павінен мастацкі кіраўнік тэатра. Галоўнага рэжысёра тэатра Д. Орлова мы ведаем як добрага выхавальніка малады х актораў. Гэта мы бачылі на яго пастаноўках, гэта было ў яго і ў мінулай педагагічнай дзейнасці. На выхаванне актораў трэба звярнуць асаблівую ўвагу. Рускаму тэатру БССР, дзе большасць маладых актораў, патрэбны рэжысёры-выхавальнікі, а не толькі рэжысёры-пастаноўшчыкі.

мінаюць словы, сказаныя ім раней:

Навошта на тыдзень раней —
Ён сам напрарочыў сабе.

Менш удалы верш «Сустрэча». У ім ёсць поўная надуманасць, сантыментальнасць. Бацьку малой дзяўчынкі забралі ў турму. Там ён памёр. Маці сказала дзяўчынцы, што ён вернецца разам з чырвонай зоркай. Прыйшлі чырвоныя байцы і яна першага з іх прыняе за бацьку.

Ты прыпала вачамі да пятліцаў
зялёных,
Не заўважыўшы з радасці той,
Што наўкола стаялі ў сляцах эскад-
рэны
Разам з бацькам, названым табой.

Гэта крыху сантыментальна, але моцна. У гэтым-жа вершы ёсць такі трапны ў сэнсе раскрыцця дзіцячай душы вобраз:

Моцна спала дзяўчынка на мулкай
дзярузе,
Да кастровай кудзелі прыпаўшы
нічком, —
Можа, сніліся дзеўчынцы
Кветкі на лузе,
Ці задзірысты певень з густым гра-
бянём...

Зусім няўдалай трэба лічыць вельмі расцягнутую паэму П. Броўкі «Дзед і ўнук», у якой адчуваюцца традыцыі дарэвалюцыйнай беларускай літаратуры. Ды і тэма вельмі характэрная для нашаніўскай літаратуры.

Асабліва-ж няўдалы сярод новых вершаў П. Броўкі верш «Застольная», у якім рытм пушкінскай «Вакхічнай песні» прыстасаван да калгаснай бяседы. З гэтага спалучэння Пушкіна і калгаснай тэмы нічога не атрымалася. Такім чынам мы бачым, што ў сваёй аснове новыя вершы П. Броўкі, за некаторым выключэннем, не могуць быць ацэнены як поспех нашай паэзіі і самога паэта. Сапраўды, у такіх творах, як «Праз горы і стэп», «1914», «Палессе», куды ярчэй адчувалася паэтычная індывідуальнасць П. Броўкі. У паэме «1914» П. Броўка паказаў незвычайнае валоданне гратэсковымі фарбамі. У творы «Праз горы і стэп» была свая манера не толькі ў слоўным вобразе, але і ў рытме. Лірычны вобраз гэтага твора не паўтараўся ў другіх паэтаў.

І галоўнае, у гэтым творы было сапраўднае адчуванне, што «кроў, багата пралітая нашымі людзьмі, не прайшла дарма».

Усё гэта не азначае, што мы заклікаем П. Броўку пісаць так, як ён пісаў тады, калі ствараліся гэтыя творы. Гэта было-б няправільна. Шмат змянілася за гэты час у жыцці, вырас і сам паэт. Але захаванне і далейшае раскрыццё той індывідуальнасці, якая праявілася ў гэтых творах, было-б безумоўна карысным.

А. Куляшоў адным з першых зразумеў, што далей пісаць пра «ельнік», «дымок» і «карусель» — справа не вельмі паважная для сапраўднага паэта.

У наш суровы век, у век, калі трэба ўздымаць баявую гатоўнасць народа, калі палова свету ахоплена пажарам імперыялістычнай вайны, песня паэта павінна скідаць цывільныя манішкі і гальштукі і апранацца па-вайсковаму. Гэта не абавязкова павінны быць творы аб вайне, альбо творы, што ў агульных словах заклікаюць да мабілізацыйнай гатоўнасці. Справа значна складанейшая і заключаецца ў тым, каб у кожнай тэме, аб якой-бы ні пісаў паэт, адчувалася гэта мабілізацыйная гатоўнасць, адчуваўся век. Каб настроі самаздаволенасці і лірычнага цырлікання не схавалі ад патомкаў наш надзіва велічны і суровы час. І задача заключаецца не ў тым, каб ужываць громападобныя інтанацыі і ўяўна-пафасныя выклікі ўсім паэтам, па аднаму стандарту, у масавым парадку. Мы ўжо мелі вопыт стварэння так званых «актуальных» вершаў, якія складаліся з агульных лозунговых фраз і выклікаў. Задача паэзіі ў тым, каб адчуванне часу было арганічным у кожнай маленькай дэталі твора. Пра што-б ні пісаў паэт, ці пра спевы салаўя, ці пра вялікі творчы парыў савецкага народа, ці пра сваю каханую — усюды ён павінен быць нараўне са сваім векам і не паддавацца сантыментальна-канарэечным настроям. Дык вось А. Куляшоў адным з першых зразумеў гэту задачу і свядома адмовіўся ад лірычна-супакойваючых вершаў.

Ён дэкларыраваў гэты свой адыход у вершы «Хлопцы апошняй вайны». Тав. Бярозкін абвясціў гэты верш «вершам хвалюючага зместу і вялікай фармальнай навізны».

Але адна справа напісаць паэтычную дэкларацыю аб патрэбнасці мужнага і суровага верша, а другая справа стварыць мастацкі твор. А верш «Хлопцы апошняй вайны» А. Куляшова з'яўляецца іменна дэкларацыяй, вершаваным артыкулам аб патрэбе суровага верша, аб тым, што паэт павінен глядзець у будучыню. Праўда, вопытная рука майстра адчуваецца і ў гэтым творы. Мы маем тут часам незвычайна моцныя вобразы.

Вельмі дарэчы ў вершы гусі, якія «адным выраем звязалі і Дняпро і Ніл», вялікай глыбіні дасягае А. Куляшоў, калі паказвае, як паміраючы баец гаворыць свайму таварышу, што застаецца жыць: глядзі на будучыню і майві вачыма. Незабыўны і такі вобраз вайны: «Цяжка ўздыхае з лясоў вайна, пехта на мове чужой кліча каня».

А. Куляшоў імкнецца ў гэтым творы падагуліць і апраўдаць ранейшую сваю творчасць, правільней асэнсаваць яе. Вось чаму агульная кампазіцыя твора і нават рытмічны лад яго нагадвае «Крыўду». А. Куляшоў аднаўляе вобразную фактуру «Аманала» і «Гарбуна».

Можа «Хлопцы апошняй вайны» крыху больш чым артыкул, але ва ўсякім разе не больш, як праспект з вершаваным азначэннем таго, якія пачуцці і думкі павінны былі-б прысутнічаць у творы аб апошняй вайне. І ўсяго. А «хвалюючы змест і фармальная навізна» тут адсутнічае.

Калі ў спрэчцы з П. Глебкам тав. Бярозкін бясспрэчна праў, дык тут ён гэтак-жа бясспрэчна памыляецца.

Па-другое, задачу стварэння паэзіі новых пачуццяў і думак, выражэння ў ёй адчування будучага нельга разумець, як задачу механічную. Маўляў, раней быў «ельнік», «дымок», «карусель», а цяпер мы возьмем за аснову суровы верш і будзем гаварыць глыбокадумныя, але не зусім зразумелыя словы аб вайне, аб будучыні.

Янка Купала адчуванне вайны выразіў аднойчы праз паводзіны птушак маццей, чым другі паэт выражае гэта праз апісанне бітвы:

Пакідаў гняздо бусел,
Свае пожні і сосны —
Паляцеў, не вярнуўся
У тыя чорныя вёсны.

Думка, выражаная А. Куляшовым у «Хлопцах апошняй вайны», наіўная і непаслядоўная. Калі наіўнасць А. Куляшова ў вырашэнні вялікіх пытанняў жыцця ў паэме «Крыўда» яшчэ своеасаблівым чынам чаравала нас, дык у «Хлопцах апошняй вайны» яна раздражняе.

Па-першае, А. Куляшоў вельмі доўга дэкламіруе аб ашуканых шчырых «хлопцах».

Шчырыя хлопцы
З Тэмзы і Сены
І адтуль, дзе плюскоча Райн,
Лепш да мяне ішлі-б...
Ёсць у мяне лугавое сена,
І зернем звініць камбайн,
І мёдам вее ад ліп.
. . . .
Павешу гамак між сукоў палявых.
Дзе вецер калісьці
Гойдаў калыскі
І зрэбныя торбы продкаў,
Закалышу, як дзяцей сваіх,
Вас,
маіх аднагодкаў.

А. Куляшоў як быццам і сам разумее, што лепшай і найбольш гуманнай навукай у часе вайны драпежнікаў супроць радзімы сусветнага пролетарыята з'яўляецца навучанне жалезам, а не гуман нападобнымі размовамі аб шчырых хлопцах. І ўсё-ж-такі гэтыя размовы займаюць значнае месца ў «Хлопцах апошняй вайны».

Гэта наіўнасць адчуваецца і ў асобных вобразах вершаў. Зноў А. Куляшоў адраджае свае даўно забытыя вобразы, гаворачы, што нам трэба абараняць «дзікія качкі ў трысці», «азёры» і «лілеі».

Савецкай паэзіі апошніх часоў нехапае навізны і яркасці слоўнага вобраза. Залішне ўжо гладкія і бясцветныя ў некаторых вершах вобразы, як гладка і бясцветна іх думка.

Але пошукі новых вобразаў павінны ісці шляхам ужывання арганічных тэме твора вобразаў, пабудаваных лагічна і на грунце рэчаіснасці. Што-ж можна сказаць аб арганічнасці ў такім вобразе, як:

Грудзі зайшліся ў жаданым
клёкаце!

Ні жаданага, ні нежаданага клёкату грудзей нельга сабе ўявіць.

Нехта знаёмы, знаёмы здалёк ідзе:
Ці дождажыку кропля над завадзю
сіняй,
Ці звонкае вяселле на высокім
покуце,
Ці шабельная ў мыльнай пене
конніца
З людскімі галовамі на покаце...

Як ідзе кропля дождажыку, можна сабе ўявіць. Можна нават уявіць, як ідзе вяселле (відаць, у сэнсе адбываецца) на высокім покуце, але як ідзе шабельная ў мыльнай пене конніца, ды яшчэ з «людскімі галовамі на покаце», уявіць сабе цяжка.

Відавочна, тут рыфма, гукавыя асацыяцыі цалкам праглынулі сэнс.

У вершы «Хлопцы апошняй вайны», акрамя ўсяго іншага, А. Куляшоў не толькі не набліжаецца да задачы даць твор, у якім быў-бы погляд у будучыню, адчуваўся-б час, эпоха, але аддаляецца, як нам здаецца, ад гэтай задачы.

Куды бліжэй ён стаяў да яе вырашэння ў такіх вершах, як «Бацька», «Ранак», дзе сапраўднае і вялікае пачуццё ўвасоблена ў суровыя радкі і дзе ёсць адчуванне часу. У вершы «Бацька» таксама гаворыцца аб пераможнай вайне нашага народа супроць драпежных сіл Захаду. Паэт гатоў памерці за справу комунізма, але яго бяссмерце ўвасоблена ў кроўнай сувязі з дачкою, а дзіцяці—з любасцю да вялікага Сталіна Усё гэта вельмі моцна выражана ў вершы «Бацька». Нарэшце, гэта з такой-жа сілай выражана і ў вершы «Ранак». Паэт трапіў у палон да ворага. Ён просіць ранак перайначыць усе сцежкі і дарогі:

У родную краіну
Дарогі перайнач.
А я? А я загіну.

І тут зусім нечаканы і патрасаюча моцны зварот к найбліжэйшаму да паэта чалавеку:

А ты?
А ты не плач.

Колькі тут сапраўднага і глыбокага пачуцця і які бяскрайні змест заложан у невялічкім вершы! Які боль і мужнасць у радках:

А ты?
А ты не плач.

Куды бліжэй, чым у сваіх апошніх вершах, стаяў і П. Броўка да стварэння сугучнага часу верша ў творы «Палеская дарога». Верш напісан не ў громападобных інтанацыях, проста і сурова.

Вельмі праўдзіва праз успаміны маленства паказваецца грамадзянская вайна:

Я помню гэтыя мясціны
Праз глыбіню дзіцячых мар —
Вятроў асеннія літаніі,
Гаворка сумная бяроз,
Стары гусляр на скрыжаванні..
Разбітай арміі абоз.

Веліч Сталіна выражана праз словы:

І невялічкі горад Горы,
Які відно за акіян.

І хоць і ў гэтым вершы нямала чыста літаратурных асацыяцый: «Тбілісі. Шота Руставелі...», аднак гэты верш адзін з лепшых вершаў П. Броўкі.

***

Якія-ж вывады можна зрабіць з разгляду апошніх твораў двух лепшых нашых маладых паэтаў.

А вывады такія, што «мілай непасрэднасці і чалавечага пачуцця», як выражаецца П. Глебка, у гэтых паэтаў нямала, але адчування рэальнасці не вельмі багата.

Пераважаюць вершы, у якіх суровая і напружаная барацьба нашага народа за чалавечае шчасце выглядае «мілай» прагулкай па кввяцістаму саду.

Самі паэты пачынаюць гэта разумець і імкнуцца знайсці выйсцё з лірычнага тупіка. Першая спроба А. Куляшова ў гэтым кірунку пацярпела няўдачу.

Але гэта не азначае, што выйсцё не можа быць знойдзена. Для гэтага трэба ўнікаць усялякага паэтычнага штампу, перапеву, пагоні за паэтычнай модай. Стварэнне так званай «мужнай» паэзіі не можа быць дасягнута і шляхам награмаджэння ваяўнічых сітуацый, агульных выклікаў, дэкламацый аб мужнасці.

Паэту трэба захаваць сваю індывідуальнасць, што называецца, застацца самім сабою і, выходзячы са сваёй творчасці, свайго паэтычнага голасу і паэтычных магчымасцей, шукаць выйсця ў свет вялікай паэзіі народа — будаўніка, воіна і пераможца.

М. ПАСЛЯДОВІЧ

НА ПЯСЧАНАЙ КАСЕ

Пісьменнік М. Паслядовіч напісаў новую аповесць — «Магістральны канал». Тэма аповесці — асушка балот калгаснікамі.

Урывак, які друкуем ніжэй, расказвае аб начной сустрэчы школьнікаў з таямнічымі падарожнікамі, якімі кіруе іх былы аднавяскоавец Сцяпан Нікановіч Кардыман. Хлопцы яшчэ не ведаюць, што начныя падарожнікі — экспедыцыя Акадэміі навук, а калгаснік Сцёпка, які шэсць год назад паехаў вучыцца, вярнуўся дахаты інжынерам-меліяратарам.

Хлопцы правялі «ненадзейных» у вёску і там неўзаметкі парассяваліся, каб хвілін праз дзесяць сабрацца ў парку.

— Мы пойдзем пільнаваць выдру, — змоўшчыцкім тонам пачаў Геня. — Засядзем каля дзвёх алешын, у кустах, і ўсё разгледзім. Ніхто з вас не бачыў выдры?

— Не, не! — загаманілі наперабой хлопцы.

— Цсс... — папярэдзіў Генька. — Нас могуць падслухаць і не пусціць. Мне ўжо абрыдзела гэтая залішняя апека. «Тое можна, а тое не можна», нібы мы нейкія малыя... Ну, дык я таксама не бачыў выдры... За мною!...

Хлопцы, падсаджваючы адзін аднаго, пералезлі цераз каменную агарожу парка і адразу апынуліся ў ціхім начным полі. Геня тут стаў і многазначна шапнуў:

— Трэба паслухаць. Можа за намі ёсць пагоня...

— Пагоня? — прамармытаў, разгублена азіраючыся, Мечык. Дык-жа мы нічога нікому не зрабілі.

— Што ты разумееш у гэтай справе? Лепш маўчы і слухай.

Генька, даўшы знак маўчаць і не варушыцца, прайшоў у адзін бок, потым вярнуўся і накіраваўся ўздоўж каменнай агарожы. Некаторы час ён зусім знік з позірку.

Мечык адчуваў, як гулка б'ецца яго сэрца. Ён ужо верыў, што нехта абавязкова павінен іх падпільноўваць і перайманць на кожным кроку. Але ціха было ў парку, у якім дзед Брыль некалі пракрадаўся з дрэсіраванай выдрай.

Геня неўзабаве вярнуўся і прашаптаў:

— Можам ісці. Яны згубілі наш след і цяпер не хутка знойдуць...

— Хто гэта яны? — вырвалася ў Лёнькі. — Што...

Геня лёгка дакрануўся да пляча Лёнькі і той змоўк.

Захоўваючы вялікую асцярогу, хлопцы рушылі ўздоўж сцяны, паміж паркам і жытам. Час-ад-часу ў каго-небудзь шоргала пад нагамі, абсыпалася ванна і трэшчалі сухія галінкі. Геня тады прысядаў і шэптам камандаваў, каб так рабілі і другія. І хоць ясна было, што ніхто за імі не гоніцца, што нікому яны не ў галаве, — трэба было так рабіць, калі гаворыць Геня! Геня ў такіх справах разбіраецца добра!

На рагу парка хлопцы павярнулі ў левы бок. Вузенькая сцежка ледзь прыкметна вырысоўвалася ў змроку. Хутка ў твар дыхнула свежасцю ракі, запахла гаркавым туманам. Ускруцілася ў паветра патрывожаная кнігаўка.

З поля быў круты абрыў на сенажаць. Перш чым спусціцца з яго, Геня яшчэ раз прыпыніўся і яшчэ раз паслухаў. Калі на полі было ціха, калі там усё спала, дык на сенажаці і цяпер усё жыло і абзывалася рознымі галасамі. Напалоханая хлопцамі кнігаўка ўсё яшчэ лётала і неспакойна крычала. Недзе зусім блізка драў скрыпучым горлам драч. На той бок рэчкі абзываліся на ззярычках качкі.

Хапаючыся за кусты, начныя вандраўнікі асцярожна спусціліся з абрыва. Пад нагамі густа зачвякала вада. Яшчэ адна кнігаўка гучна хлабыснула ў паветры крылом. Драч, які крычаў непадалёку наперадзе, цяпер абзываўся ўжо далей і недзе збоку.

— Не адставайце! — камандаваў Геня. — Паварачвайцеся ўправа на груд. І наперад не заскаквайце, а то яшчэ ў рэчку ўваліцеся. Тады вадою ў самую пушчу знясе. Ну, вот і алешыны. Цсс...

Геня ўжо шаптаў, і хлопцам здалося, што ён нешта ўбачыў. У гэтай цемры яны маглі паверыць кожнаму яго слову, паслухацца кожнага яго штуршка.

Геня часу дарэмна не траціў. Ён загадаў шэптам, каб хлопцы затаіліся ў кустах і там сядзелі, не варушачыся, пакуль ён не падасць каманды. Крокі за чатыры ад іх нячутна струменіла ў нізкіх берагах рэчка. Яна хутчэй угадвалася, чым была відаць. На другім беразе ціха шалясцелі чароты.

З поўгадзіны прасядзелі хлопцы не варушачыся. У Лёнькі ўжо здранцвела левая нага, а ён не адважваўся перамясціцца. Ужо супакоіліся кнігаўкі, змоўклі ці задрамалі драчы, як раптам вада каля берага ўзарвалася з такім шумам і сілай, што пырскі даляцелі аж да хлопцаў.

— Выдра! — бадай у адзін голас крыкнулі яны. — Выдра...

— Ціха вы! — строга абазваўся Геня. — Не выдра, а шчупак. Выдра яшчэ ў нары сядзіць...

Яшчэ раз разарвалася гулкім усплёскам начная цішыня, але ўжо значна ніжэй па рэчцы. Потым каля хлапцоў нешта захлюпала і зашумела ў густым аіры. Гэта, відаць, былі вадзяныя пацукі, якія шнырылі па лузе ў пошуках здабычы.

Потым цемра патроху пачала рассейвацца, нібы наставаў новы дзень. Узыходзіў над заснуўшымі палямі і лясамі маладзік-месяц. Ужо добра азначыліся кусты, і цені папаўзлі ад іх па вадзе. Але разам з месячным святлом пачаў насоўвацца з таго берагу ракі — з дрыгвяністых бяскрайніх прастораў — густы туман. Ён быў белы, як малако, з гаркавым халодным пахам. Кусты зноў зніклі ў гэтай густой і вільготнай пялёнцы. Начныя гукі глушэлі, выходзілі, здавалася, аднекуль з-пад зямлі.

— Генька, — прашаптаў Лёня. — Хадзем дахаты. Тут няма ніякае выдры. Дзед Брыль нахлусіў.

— Папільнуем яшчэ трошкі... Паглядзім...

—Дык-жа нічога не відаць! Я ўжо вады не бачу... Хадзем, а то заблудзімся.

— І холадна нешта, — падтрымаў Лёньку Мечык.

У гэтую хвіліну хлопцы пачулі нейкія галасы і глухія ўдары вёсел аб лодку. Нехта плыў зверху па рацэ. Над галовамі хлапцоў праляцела напалоханая качка.

Хлопцы паднялі галовы і прыслухаліся.

— Далей плыць не варта, — дайшоўся да іх глухі, як з-пад зямлі голас. — Тут, недзе з левага боку, павінна быць каса...

— А можа яшчэ кіламетраў пяць прагонім? — пачуўся другі голас, у якім хлопцам здалося штосьці знаёмае. — Там зробім прывал і пойдзем да Антося Мікалаевіча.

— Навошта хадзіць пяць кіламетраў, калі можна прайсці адзін. Мы якраз там, дзе нам трэба быць: насупроць калгаса «Зялёны бераг».

— Калі так, дык трэба спыніцца. Сапраўды, далей ехаць не варта. Усёроўна нічога не відаць у гэтым чортавым тумане!

Зноў загрукалі вёслы. Пачуўся шоргат лодак аб узбярэжны жвір. Відаць, незнаёмыя вылезлі на пясчаную касу і там выбіралі месца для начлегу. Неўзабаве хлопцы пачулі, што тыя пачалі гаварыць пра агонь. Мечык улавіў, як трэшчала сухое голле, якога многа было ў прырэчных кустах, чуў, здавалася, як чыркнула запалка. Але полымя не ўбачыў. Ды наогул было дзіўным, як магло прабіцца святло праз гэтую густую вільготную пялёнку ночы. Праз некаторы час нават гаворка на пясчанай касе стала яшчэ больш глухой і невыразнай.

— Ну, што вы скажаце? — урачыста прашаптаў Генька. — Выдры няма, але мы можам паглядзець, што гэта за начныя вандраўнікі! І паглядзець так, што яны аб нашай прысутнасці ніколі не здагадаюцца.

— А можа гэта... гэта... — Лёнька нават баяўся выгаварыць патрэбнае слова.

— Ну, што?

— Ну, гэта... бандыты. Хадзем лепш дахаты. Генька...

У гэтую хвіліну Лёнька асцерагаўся не толькі бандытаў. Ён раптам успомніў, што маці, адыходзячы на поле, строга-настрога загадала яму нікуды з двара не сыходзіць і своечасова пераняць у пастуха і загнаць у хлеў збрадлівую карову. І цяпер невядома, дзе можа вандраваць гэтая праклятая жывёліна і што рыхтуе для Лёнькі матка. Стары вартаўнік так загаварыў зубы, што Лёнька забыўся на ўсё на свеце. Матка недзе непакоіцца і пра тое, дзе сыпоў Лёнька. Усякія думкі могуць прыйсці ў галаву маці, асабліва, калі на двары ноч, асабліва, калі ніхто з суседзяў не можа сказаць, дзе падзеўся Лёнька, — гэтак спрытна і неўзаметку зніклі яны з бацькоўскага позірку. Лёнькава спіна аж гарэла, калі ён толькі стаў думаць, якая ўзнагарода можа быць за такую авантуру. І раскаянне і страх апанавалі хлапца.

Да чорствага сэрца Генькі, відаць, яшчэ не дайшло ўсведамленне вробленага ўчынку, бо ён толькі засмяяўся ў адказ на прапанову сябра. Не кожны раз здараецца хлопцам вандраваць поначы на беразе ракі, асабліва ў такі час, калі сталі наспяваць у калгасе нейкія важныя падзеі. Людзі на лодцы спамянулі, ды яшчэ з павагай, імя старога манюкі. Хто яны такія і чаго яны тут апынуліся?

Але наблізіцца да невядомых выказаў ахвоту толькі Мечык, які ні ў чым не хацеў саступаць Геньку. Лёнька і астатнія хлопцы рашуча адмовіліся ісці насустрач невядомым небяспекам, якіх так прагнуў гэты шалёны Генька.

— Няхай сабе паўзуць дахаты, — пагардліва прамовіў ён. — З імі толькі лішняя цеганіна. Яшчэ возьмуць ды разравуцца ў рашучую хвіліну...

Радыя, што вызваліліся ад гэткага суровага камандзіра, якому яшчэ невядома што можа стукнуць у галаву праз поўгадзіны, хлопцы павярнулі ад ракі.

— Толькі пахлёпайце мне! — прыгразіў ім Геня. — Уцякайце так, каб на касе вас не пачулі.

— І навошта мы бралі з сабою гэтых жоўтаротых блазнюкоў? — здзівіўся Мечык. — Можа там, на касе, пачулі, як мы тут таргаваліся? Цяпер да іх, бадай, ці падкрадзешся!

Але на касе не бачылі і не чулі хлапцоў. Пяць чалавек, якіх асвятляла полымя раскладзенага кастра, былі занятыя сваімі справамі. У кожнага з іх на нагах былі боты з даўжэразнымі, вышэй кален, мяккімі халявамі. У цёмных штанах, у кароткіх цёмных куртках, з аднолькавымі капялюшамі на галаве, яны нагадвалі ніто разбойнікаў, ніто каўбояў, якіх хлопцы неаднойчы бачылі на малюнках. Гэтае ўражанне ўзмацнялася яшчэ і двума стрэльбамі, што былі павешаны на сухастойнай балотнай сасонцы. Магчыма, у іх былі яшчэ стрэльбы, але яны іх не даставалі з двух, усцягнутых на пясок, шырокіх плоскадонак. Мечыку вельмі хацелася ўведаць яшчэ, што за наклажу на лодках прыкрывае калянае палотнішча брэзенту. Можа гэта было дабро, якое награбілі гэтыя невядомыя людзі ў прырэчных калгасах? Можа там былі невядомыя афяры?

— Ну, каешся, што пайшоў са мною? — узрушана зашаптаў Геня. — Бачыў ты калі такую форму?

— Цсс... Вунь той барадаты сюды глядзіць...

Мечык знямеў і прыгнуўся за кустом яшчэ ніжэй. Барадач, які сядзеў па той бок агню, сапраўды пазіраў на кусты. Асветленыя полымем вочы яго былі нейкія нерухомыя і, здавалася, налітыя крывёю. Яго гарбаты нос нагадваў дзюбу злоўленага дзедам Брылем арла.

Усё ў грудзях Мечыка абвяла, калі Геня прашаптаў:

— Гэта, мусіць, іхны атаман!

Мечык ужо адчуваў, што яго ногі аслаблі зусім, што цяпер ніякая сіла не прымусіць яго скрануцца з месца. Лепш бы яму, Мечыку, праз зямлю цяпер праваліцца, каб не бачыць таго відовішча, да якога яго прыцягнула неўтрапёная прагнасць прыгод Гені Шымкаўца...

— Тыдні праз два, праз тры ад усяго гэтага застанецца адзін толькі ўспамін! —вымавіў, нарэшце, барадаты. — І чалавек не пазнае балота. Зусім іншай тут будзе геаграфія праз два-тры тыдні.

— Ваша прароцтва будзе выканана, камарада Шамай, — абазваўся чалавек, які прынёс з лодкі кашолку і кацялок. — А пакуль што ці не дапамаглі-б вы наабіраць бульбы на вячэру? Дастаньце, калі ласка, ваш ножык і пакажыце сваё майстэрства ў больш празаічнай справе.

— Страўнік мой — вораг мой... — пачаў быў барадаты, але мужчына, які прынёс кацялок, перапыніў:

— Якое глупства вы гаворыце! Мяркуючы па вашаму выгляду, нешта не верыцца, каб ваш страўнік быў вашым ворагам. Дзевяноста кіло вагі, мускулы, як стальныя канаты.

— Социяльнае паходжанне і нічога другога, дарагі Шэрман. Мой дзед быў бурлаком, а бацька каралём грузчыкаў...

— Добра, добра. Бярыцеся за працу.

Барадаты дастаў з кішэні невялічкі складаны ножык і падсеў да чыста пабрытага Шэрмана. Трэці з незнаёмых прыстройваў над агнём кацялок з вадою. Яшчэ два нечага шукалі ў лодцы.

— Барадаты не атаман! — безапеляцыйна шапнуў Мечыку Геня. — Атаман гэты доўгатвары, што загадваў яму абіраць бульбу. Запомні: Шэрман яго прозвішча... Шэрман...

І раптам хлопцы як не ўскрыкнулі ад здзіўлення.

Адзін з тых, што корпаліся яшчэ ў лодцы, выскачыў на зямлю і падышоў да агню. У руках ён нёс чатыры банкі кансерваў. Калі полымя асвятліла яго шырокі твар, хлопцы заўважылі на левай шчацэ добра знаёмы прышчык.

Гэта быў чалавек, які прыязджаў да старога вартаўніка з візітам! Чалавек, які нахабна парушыў усе традыцыі заязджаць раней у праўленне...

Яшчэ не апамяталіся хлопцы ад гэтай сустрэчы, як з'яўленне новай асобы, пятага чалавека з гэтага зборышча — нашчэнт зблытала розныя здагадкі і меркаванні.

Першае, што кідалася ў вочы — гэта яго ўпэўненая паходка нават у тых месцах, якія слаба асвятляліся агнём. Здавалася, гэты чалавек ведае тут кожную калдобіну, кожную купіну. У той час, калі другія ўважліва прыглядаліся, ідучы да лодак ці накіроўваючыся па ламачча. сабе пад ногі, каб не зачапіцца за корч ці не трапіць у лужыну, — гэты чалавек хадзіў прызвычаена, нібы яго ногі самі бачылі. дзе трэба ступаць.

Выгляд у яго быў надзвычай усхваляваны і нагадваў чалавека, які пасля доўгай разлукі вярнуўся, нарэшце, у свой бацькоўскі дом і ў першую хвіліну не ведае, за што зачапіць рукі.

З лодкі гэты чалавек дастаў і паднёс да агню невялікі чамадан і яшчэ нейкі, загорнуты ў жоўтую паперу, скрутак.

— Ну, вот вы і дома, — звярнуўся да яго той, якога звалі Шэрманам. — Вас сёння, напэўна, не чакаюць.

— Магчыма. Я нікога не папярэджваў.

Ён прысеў на чамадан і дастаў з кішэні папяросы. Закурыў і некаторы момант пазіраў у цемру, у той бок, дзе схаваліся хлопцы.

— Шэсць год я тут не быў, таварыш Шэрман. Многае, напэўна, змянілася ў калгасе. Многія, асабліва моладзь, можа і не пазнаюць мяне. Але рака, балота засталіся-ж тымі самымі. Тая-ж багна, той-жа туман уначы...

— Праз два-тры тыдні вы не пазнаеце гэтага балота, — падняў галаву барадач. — І вы самі будзеце тут віною, Сцяпан Нікановіч! Гэта-ж цэлая рамантыка! Выехаць адсюль трактарыстам, вярнуцца інжынерам-меліяратарам...

— Так, я адчуваю вялікае здавальненне. Паехаць адсюль адным і прыехаць другім. Вярнуцца назаўсёды ў родныя мясціны.

На некаторы час усе змоўклі. Бульба з кацялка перабралася ўжо ў больш кацёл, які вісеў над агнём. Потым чалавек рашуча ўстаў з чамаданам.

— Ну, я, таварышы, забягу на хвіліну дахаты. А вы тут вячэрайце. У дванаццаць гадзін знімемся з якара, як кажуць маракі. Нам цяпер дорага кожная хвіліна.

— А як з паляўнічым Брылем? Мы без яго не выканаем нашай задачы, — прамовіў Шэрман. — Стары ўпёрся, як зубр. Нават не адказаў на ліст прэзідэнта. Пагаварыце з ім вы, Сцяпан Нікановіч. Можа вам пашанцуе прыбраць яго к рукам...

— Не турбуйцеся. Праз гадзіну стары будзе ў нашай лодцы. А вы тут спяшайцеся. Ну, я пайшоў.

Ён падняў чамадан, узяў скрутак і знік у тумане.

І хлопцы, якія ўжо знямелі за кустамі ад нерухомасці, цвёрда вырашылі: атаманам у гэтай камандзе не барадач, не доўгатвары Шэрман і не чалавек з прышчыкам, а Нікановаў Сцёпка. Іх аднавяскоавец Сцяпан Нікановіч Кардыман, як яго называлі гэтыя разбойнікі.

Асцярожна, нямеючы ад кожнага ўсплёску вады пад нагамі, хлопцы адступілі назад. Калі ўжо не было відаць агню і не было чуваць галасоў з касы, Генька кулём рвануўся па сенажаці. За ім, то пагразаючы ў торфе, то чапляючыся за купіны, ляцеў Мечык.





Аддзел дзіцячай літаратуры Дзяржаўнага выдавецтва БССР рыхтуе аднатомнае выданне «Казак 1001-й ночы» у арыгінальным афармленні мастака **М. Ваксера.** Публікуем некаторыя з ілюстрацый М. Ваксера.



ПАЭМА АБ ВЫЗВАЛЕННІ

Дакументальны кінофільм „На Дунаі"

Да хранікальных фільмаў мы часта адносімся з нейкім недавер'ем. Лаканічнасць сюжэтаў, абрыўчатасць, адсутнасць адзінай драматургічнай лініі амаль ніколі не даюць гледачу поўнага ўяўлення аб багацці жыцця. І гэта непаўната пакідае законнае пачуццё нездаволенасці.

«На Дунаі» — таксама фільм хранікальны. Але ён зроблен настолькі ярка, што з першых-жа кадраў захватвае гледача, прымушае яго хвалявацца, жыць разам з героямі, разам з народам. Удалае спалучэнне суровасці і лірыкі надае фільму надзвычайную стройнасць, паэтычную ўзнёсласць.

Гасне святло і на экране паяўляюцца першыя кадры фільма. Сады, вінаграднікі, шырокія сонечныя прасторы, залітыя морам буйных каласоў і спелых высокіх сланечнікаў. Ідуць палямі машыны, збіраючы багаты ўраджай. Вясёлыя, радасныя твары дзяўчат, старыкоў. Гэта наша савецкая Малдавія. А тут-жа побач, за цёмнаводным Днястром, ляжыць яе родная сястра—Бесарабія, якую больш двух дзесяцігоддзяў таптаалі румынскія баяры. Багатая, але высмактаная прагнымі эксплаататарамі зямля, уся парэзаная вузкімі шнурамі. Нізкія, аброслыя травою і мохам сялянскія хаты. Худыя, знямоганыя твары людзей, што даўно ўжо з надзеяй глядзелі на гэты бераг Днястра, чакаючы вызвалення.

І час вызвалення настаў. 28 чэрвеня 1940 года праз раку Днестр рушылі часці Чырвонай Арміі, выконваючы волю ўрада і ўсяго савецкага народа.

Магутным поступам рушылі танкі, загудзелі самалёты, пайшлі пехацінцы. Народ святкуе. Букеты кветак, буханкі белага хлеба выносяць людзі насустрач. Песні, смех, ласкавыя ўсмешкі. Пахмура глядзяць румынскія афіцэры на радасць народную. Яны цяпер увачавідкі ўбачылі, як «соладка» жылося прыняволенаму народу пад іх панаваннем.

Вось стары селянін, чорны ад голаду і поту, абнімае чырвонаармейца і, энергічна размахваючы рукамі, нешта расказвае яму. Вось аркестр з вясковых музыкантаў іграе самімі музыкантамі складзены гімн «Смутак па радзіме», у якім гаворыцца аб вялікай народнай надзеі ў вызваленне і далучэнне да сваёй вялікай сацыялістычнай радзімы—СССР. Просты, хвалюючы гімн! Вось стыхійны мітынг на магіле ахвяр татарбунарскага паўстання. У 1924 годзе румынскія карныя атрады і сігуранца замучылі тут некалькі дзесяткаў чалавек і зруйнавалі дарэшты непакорную вёску Татарбунары.

На кожным кроку — гістарычныя помнікі. Старадаўнія рускія гарады, што носяць сляды мінулых бітваў, вялікіх сувораўскіх паходаў. Ізмаіл, Акерман, Кагул... Грозныя некалі сцены цытадэляў — сведкі славы рускай зброі.

Чэрнавіцы і Кішынёў. Бліскучыя цэнтры і ў некалькіх кроках—брудныя, цёмныя ўскраіны.

Вялікі рускі паэт Пушкін апяваў бесарабскія землі. На адным з сквераў у Кішынёве стаіць помнік яму. На працягу двух кіламетраў цягнуцца сцены старадаўняй крэпасці на беразе Днястроўскага лімана. На адной з шматлікіх вежаў гэтай крэпасці, як расказваюць бесарабцы, усю ноч аднойчы прастаяў Пушкін...

Вось вёска — радзіма славутага палкаводца Катоўскага. Вось Фурманаўка Хвалюючая сустрэча двух братоў: худога, згорбленага ад непасільнай працы бесарабскага селяніна Цімашэнкі і маршала Савецкага Саюза Народнага Камісара абароны СССР тав. Цімашэнкі.

Бесарабія і Паўночная Букавіна — савецкія навечна. Маўкліва адыходзяць румынскія афіцэры, іх праводзяць іранічнымі поглядамі людзі. Не вярнуцца ім больш! Не вярнуцца ніколі!

Бурна плыве шырокі блакітны Дунай. Тут наш рубеж. Савецкія баявыя караблі з Чорнага мора прайшлі ў Дунай. Ллюцца плаўныя гукі вядомага вальса Івановіча «Дунайскія хвалі». Пераклікаючыся з іншымі лірычнымі матывамі, дунайская тэма праходзіць своеасаблівым лейтматывам праз усю кінолету.

З вялікай цеплынёй і праўдзівасцю паказаны ў гэтым фільме людзі і падзеі, гістарычныя чэрвеньскія падзеі.

Аўтары фільма (рэжысёры — Я. Пасельскі і І. Капалін пры ўдзеле групы аператараў Цэнтральнай і Украінскай студый кінохронікі) стварылі цікавы, глыбока хвалюючы фільм — паэму аб вызваленні, паэму яркую і пераканаўчую.

М. БЛІСЦІНАЎ.

У ЦЫРКУ

Мінскі Дзяржаўны цырк у гэтым сезоне не цешыў гледача разнастайнасцю праграмы. За ўсё лета праграма змянілася, самае большае, тры разы. Натуральна, што гэта не магло не адбіцца і на прыходнай частцы касы цырка. Толькі выступленне чэмпіяната французскай барацьбы некалькі ажывіла яго наведванне.

Але пры беднасці праграмы нашага цырка ён паказаў рад нумараў добрай якасці.

Бязменная ў гэтым сезоне сям'я Манжэлі пад кіраваннем засл. артыста РСФСР ордэнаносца А. А. Манжэлі карысталася вялікай увагай публікі.

Работа джыгітаў-коннікаў Алі-Бек у дасканалым тэмпе, спрытнай і віртуознай коннай тэхніцы, у выразнай кампазіцыі нумара заслугоўвае ўсякай пахвалы. Выступленне трупы Алі-Бек мае характар агітацыі за масавае авалоданне тэхнікай конна-баявой падрыхтоўкі, за здачу норм «Варашылаўскага конніка». Імпазантна-бліскучае афармленне нумара і нястрымная адвага коннікаў, уласцівая горцам, захаплялі гледача, які ўзнагароджваў артыстаў шчырымі апладысментамі.

Асобна трэба адзначыць арыгінальную, адзіную ў гэтым жанры, работу эквілібрыста Егорава. Прагледаючы выступленне гэтага цыркача-рэкардсмена, пераконваешся, якую вялікую сілу трэба было затраціць на тое, каб дабіцца такой выдатнай тэхнікі ўсяго арганізма і, галоўным чынам, рук.

Калі ў праграмах сёлетняга сезону мы будзем шукаць сапраўды цыркавых нумараў, у іх непаўторнай цыркавой спрытнасці, эксцэнтрычнасці, забаўляльнасці, то, апрача конных выступленняў, мы павінны спыніць сваю ўвагу на велафігурыстах Вартаніо, як на нумары эксцэнтрычным, тэхнічна зладжаным, на які глядзіш з прыемнасцю, і на групе эквілібрыстаў на дроце Орланда, якія паказваюць сваю работу ў лёгкай цыркавой манеры. Трэба толькі папракнуць Орланда ў сюжэтнай недапрацаванасці выхаду. Работа дрэсіроўшчыка жывёл А. В. Галымбоўскага вельмі ўдалая, з пачатку да канца яўляе сабою тыповы цыркавы, абавязковы на манежы, жанр. Непасрэднасць, прастата і скромнасць здольнага дрэсіроўшчыка захапляе публіку і сведчыць аб вялікіх здольнасцях артыста.

Выдатную гімнастычную работу на турніках паказала цыркавая моладзь — Ненашэў, Трышын, Зайцаў і Вазнесенскі. Пасля гэтага нумара са здзіўленнем і неўразуменнем глядзіш на мастацкую акрабатыку групы пад кіраваннем Лазіча і хочаш задаць пытанне мастацкаму кіраванню цырка: «Навошта патрэбна такая?» Бадай, толькі для таго, каб заняць час, запоўніць праграму ў пагоні за разнастайнасцю прадстаўлення.

Пастановачная работа з яе таннымі «арыгінальна-эксцэнтрычнымі» аншлагамі, балетам і «уласнай» клаунадай Лаўроўскага, з імкненнем стварыць адзіны цыркавы спектакль яўна не ўдалася. Калі акторы Варнавіны больш-менш цярпімыя музыканты, дык яны зусім не клоуны. Іх выхад бледны, не выклікае ніякага поспеху. Увесь дыялаг «прызнання ў каханні» — плён дрэннага аўтарскага матэрыялу ў бяздарнай акторскай інтэрпрэтацыі, таксама як і пошлая клаунада-буфф Лаўроўскіх.

Не выклікаў асаблівага ўхвалення гледача і атракцыён 3—Бараненка і гэта трэба вытлумачыць тым, што падобных «паветрана-аэрапланных - падкупалавых» нумараў за апошні час паявілася вельмі шмат і яны ўвайшлі ў праграму цырка ў якасці «абавязковага асартыменту», капіруюць адзін другога і тым надакучылі публіцы.

Клоун Л. Б. Ружанскі, бясспрэчна, таленавіты цыркач «і ля каўра і з рэплікай», але, валодаючы вялікімі магчымасцямі і здольнасцямі к найбольш вострым і характэрным «антрэ і паузам», абмяжоўваецца найменшай затратай сіл і сродкаў у стварэнні свайго рэпертуару, што вядзе к сістэме павярхоўнай апрацоўкі «падручнага» матэрыялу.

Добра падабраны чэмпіянат барцоў з прадстаўнікоў разнастайных стыляў тэхнікі французскай барацьбы кожны дзень дапаўняе цыркавую праграму выдатнай дэманстрацыяй складанага і цікавага фізічнага спорту.

В. МУРАТ.

Зборнік тэкстаў па беларускай літаратуры XIX стагоддзя

Пад рэдакцыяй народнага паэта БССР Янкі Купалы ў выдавецтве Акадэміі навук БССР выходзіць з друку зборнік тэкстаў па беларускай літаратуры XIX стагоддзя. Памер зборніка — 16 друкаваных аркушаў, у яго ўвайшлі як тэксты вядомых твораў, так і новыя, знойдзеныя за апошнія часы ў архівах. Зборнік прызначаецца ў якасці дапаможнага падручніка для студэнтаў літаратурных і філалагічных факультэтаў вышэйшых навучальных устаноў.

Над складаннем зборніка і апрацоўкай матэрыялаў працавала брыгада навуковых работнікаў Інстытута літаратуры і мовы Акадэміі навук БССР у складзе т.т. В. Барысенкі, М. Ларчанкі і Л. Фігілоўскай.

Антон Бялевіч

Пра жорава

Не трубіць табе ў ціхіх ракітах,
Не павісне твой кліч на лясах.
Валавянай шрацінкай адлітай
Тваіх крылляў спынілі узмах.

Не скажу табе больш на змярканні,
Як бывала асенняй парой:
— Сівы жораў, бывай! Да спаткання!
Прылятай з маладою вясной!

І стаіш ты ў кутку у юнатаў,
Адзінокі, без блізкіх сяброў.
Толькі крыллі шырока распяты,
Як-бы к небу ты ўзняцца гатоў.

Не трубіць табе ў ціхіх ракітах,
Не павісне твой кліч на лясах.
Валавянай шрацінкай адлітай
Тваіх крылляў спынілі узмах.

— ⊙ —

Няўхільна выпаўняць Указ

Новым творчым уздымам адказваюць патрыёты сацыялістычнай радзімы—работнікі мастацтваў нашай рэспублікі на Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня. Умацаванне працоўнай дысцыпліны, павелічэнне рабочага дня дае мажлівасць палепшыць якасць абслугоўвання гледача, павялічыць лік пастановак і эстрадных выступленняў.

Але не ўсе работнікі тэатраў і відовішчных прадпрыемстваў Гомельскай абласці з усёй сур'ёзнасцю падышлі да ўмацавання працоўнай дысцыпліны і перабудовы работы ў адпаведнасці з новымі ўмовамі. Пачынае свой сезон Гомельскі абласны тэатр, а работнікі тэатра не ведаюць, як будзе арганізавана работа ў сувязі з пераходам на сямідзённы тыдзень і васьмігадзінны рабочы дзень, колькі трэба даць новых пастановак і інш. Намеснік дырэктара тэатра тав. Калатуеў з першага жніўня «не выбярэ часу», каб заняцца пытаннем працоўнай дысцыпліны. Да апошняга часу ў тэатры не было табеля прыходу і ўходу работнікаў. Па завярэнню супрацоўніка дырэкцыі тав. Якубсон, выпадкаў парушэння дысцыпліны ў тэатры няма, але ніякіх дакументаў для пацвярджэння гэтага не існуе. Работу тут пачыналі ў 9 гадзін і канчалі ў 5. Такім чынам, час абеду залічваўся, як «рабочы час».

У Гомельскім музычным вучылішчы завялі табель і на тым заспакоіліся. Загадчык навучальнай часткай тав. Кутневіч бывае часам «да такой ступені заняты», што не знаходзіць часу распісацца ў сваім прыходзе на работу. Рэгістрацыі ўходу з работы наогул не вядзецца.

У Доме народнай творчасці дасюль адзначалі толькі прыход на работу, а дырэктар дома тав. Хает зусім не быў уключан у табель.

На нарадзе кіруючых работнікаў мастацкіх устаноў Гомельскай абласці былі зроблены адпаведныя вывады. Намесніку дырэктара абласнога драмтэатра вынесена вымова. Пад асабістую адказнасць дырэктароў мастацкіх устаноў прапанавана неадкладна навесці парадак ва ўліку рабочага часу і прыцягнуць да адказнасці вінаватых у парушэнні Указа ад 26 чэрвеня.

Т. ПАДАБЕДАВА.

— ⊙ —

Юбілеі Янкі Купалы і Змітрака Бядулі

Набліжаюцца слаўныя юбілеі старэйшых майстроў беларускай літаратуры — 35-годдзе літаратурнай дзейнасці народнага паэта БССР ордэнаносца Янкі Купалы, якое будзе адзначана грамадскасцю нашай рэспублікі ў снежні, і 30-годдзе літаратурнай дзейнасці пісьменніка-ордэнаносца Змітрака Бядулі, якое будзе адзначана ў кастрычніку.

Створаны юбілейныя камісіі.

У складзе камісіі па правядзенню юбілея Янкі Купалы сакратар ЦК КП(б)Б тав. В. Малін (старшыня), нарком асветы БССР тав. Е. Уралава, прэзідэнт Акадэміі навук тав. К. Горэў, адказны рэдактар «Звязды» тав. Т. Гарбуноў, начальнік Упраўлення па справах мастацтваў тав. А. Озірскі, народны паэт БССР Якуб Колас, пісьменнікі Міхась Лынькоў, Міхась Клімковіч, Пятрусь Броўка і Філіп Пестрак.

У камісію па правядзенню юбілея Змітрака Бядулі ўвайшлі т.т. К. Горэў (старшыня), Т. Гарбуноў, А. Озірскі, Янка Купала, Максім Танк, Пятро Глебка, Кузьма Чорны і Міхась Клімковіч.

6 верасня адбылося першае пасяджэнне юбілейных камісій, якія намецілі канкрэтныя мерапрыемствы па правядзенню юбілеяў Янкі Купалы і Змітрака Бядулі.

У БЕЛАСТОК НА СВЯТА

У бліжэйшыя дні ў Беласток, для ўдзелу ў святкаванні гадавіны вызвалення Заходняй Беларусі з-пад белапанскай няволі, з Мінска выязджае брыгада пісьменнікаў. У складзе брыгады тт. Я. Купала, М. Лынькоў, К. Крапіва, П. Броўка, А. Кулешоў.

У Беластоку будзе праведзен рад літаратурных вечароў, прысвечаных слаўнай гадавіне. Пісьменнікі раскажуць аб гераічным вызваленчым паходзе Чырвонай Арміі 17 верасня 1939 года.

Адказны рэдактар І. Д. ГУРСКІ.

У 4002. Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Савецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць штотыднёва. Мінск, друкарня «Звязды».